Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּרעלעטאריער פון אלע לענדער, פאַרייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І САЛДАЦКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЧАЦВЕР
22 кастрычніка 1931 г.
№ 245 (3334)

НЕ ЗАДЕРЖИВАЙ
I-б. Советская Беларусь
Москва, Моховая 3
библиотека СССР им.
отд. обмен. адвин

ЧАС НЕ ЧАКАЕ!

На гледзячы на тое, што мінулі ўсе тэрміны сканчэньня ўборкі бульбы, вызначаныя адпаведнымі пастановамі партыі і ўраду, ня гледзячы на настойлівае пахаладаньне, сотні і тысячы га бульбы стаяць няўбранымі на палёх Савецкай Беларусі, а тэмпы ўборкі працягваюць заставацца яўна незадавальняючымі. Да 15 кастрычніка выкапана ўсяго толькі 63,2 проц. бульбы —больш адной трэцяй часткі ўраджаю ляжа ў зямлі. Нарастаюць тэмпы ўборкі надзвычайна слаба. Так, апошняя пяцідзёнка дала толькі 16,7 проц. прыросту.

Слабыя тэмпы ўборкі бульбы непасрадна адбіваюцца на тэмпах адпружкі яе пралетарскім цэнтрам БССР і Ленінграду. Плян забясьпечаньня бульбай Менску выкананы на 20 проц., Віцебску—на 22,8, Гомлю — на 10,1 пр. (гэта паводле даных на 10 кастрычніка). Заданьне па адпрузцы бульбы Ленінграду выкананa, прыкладна, у разьмеры 50 проц.

Той факт, што рад раёнаў—Асьвея, Лёзна, Расоны скончылі ўборку бульбы, што рад іншых раёнаў — Вуада, Вяголь, Чырвоная Слабада, набліжаюцца да сканчэньня, — гэты факт красамоўна сьведчыць аб тым, што аставаньне многіх раёнаў Савецкай Беларусі нельга апраўдаць нічым. Ніякія «аб'ектыўныя» прычыны ня могуць быць прыняты пад увагу. Посьпехі адных раёнаў і прарывы другіх у справе ўборкі бульбы тлумачацца тым, што першыя раёны здолелі забясьпечыць мабілізацыю калгасьнікаў і шырокіх мас бядняцка-серадняцкага сялянства вакол задачы забясьпечаньня пралетарскіх цэнтраў бульбай, здолелі арганізаваць працу на бульбяных палёх на аснове зьдзельшчыны, на аснове разгорнутага сацыяборніцтва і ўдарніцтва, здолелі забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва, а другія раёны аказаліся нездольнымі ажыцьцявіць гэтыя неабходныя мерапрыемствы.

Барацьба за бульбяны ўраджай зьяўляецца сур'ёзным і адказным экзаменам для раённых партыйных органаў сацый, для РВК і сельсаветаў, для ўсёй калгаснай сыстэмы. Многія раёны пакуль-што гэтага экзамену ня вытрымалі. Рад раёнаў ганебна цягнецца ў хвасьце і паказвае нездольнасьць свайго кіраўніцтва змагацца за перамогу. Так, Чавускі раён убраў толькі 11,9 проц. бульбянага ўраджаю. Касьцюковіцкі раён—25 проц., Рэчыцкі раён—24,3 проц.

Асабліва недапушчальным, асабліва ганебным зьяўляецца адставаньне саўгаснай сыстэмы і прыгародных гаспадарак.

На фронце ўборкі бульбы неабходны рашучы і хуткі пералом. Бліжэйшыя дні павінны прынесьці перамогу. Раённыя партыйныя арганізацыі павінны мабілізацыяй усіх сваіх сіл забясьпечыць апэрацыйнае кіраўніцтва на гэтым участку работы.

Што трэба зрабіць? У калгасах неабходна ўзьняць працоўную дысцыпліну, неадкладна, зараз-жа перавесьці ўсе работы па ўборцы бульбы на зьдзельшчыну, паладзіць сталы ўлік працы, забясьпечыць выхад на работу ўсіх калгасьнікаў, у тым ліку калгасьніц і падлеткаў. Трэба сказаць, што жаночая рабочая сіла дагэтуль слаба, зусім недасталкова выкарыстоўвалася ў калгасах на ўборцы бульбы. Тое-ж самае і з рабочай сілай падлеткаў. У бліжэйшыя дні, якія вырашаюць посьпех нашай барацьбы за бульбяны ўраджай, неабходна арганізаваць выхад на работы ўсіх калгасьнікаў.

У саўгасах і прыгародных гаспадарках трэба рашуча ўзьняць тэмпы ўборкі. Неабходна падкрасьліць, што фабзаўмясцкомы гарадоў слаба дапамагаюць прыгародным гаспадаркам. Рабочыя, служачыя і іх сем'і дастаткова не мабілізаваны на барацьбу за хутчэйшае скончэньне ўборкі. Пасылка рабочых брыгад утвараецца несыстэматычна. Прыгародныя-ж гаспадаркі з свайго боку не арганізавалі выплату часткі заработку натурай і часам выкарыстоўваюць рабочыя брыгады не па прызначэньні.

Пасылка рабочых брыгад на палі зьяўляецца выразам пралетарскай дапамогі вёсцы, зьяўляецца выразам мацнеючай вытворчай змычкі паміж горадам і вёскай. Рабочыя брыгады заводаў і фабрык дапамагілі ўжо не адна му саўгасу і калгасу. Гэтая дапамога павінна быць яшчэ больш пашырана і ўзмоцнена. Аднак, адначасова неабходна падкрасьліць спробы кулацтва спэкуляваць на гэтай дапамозе гораду. З некальких калгасаў нам паведамляюць аб падрыўнай рабоце кулацтва, якое спрабуе дэзарганізаваць калгасныя масы, дэмабілізаваць іх гутаркамі наконт таго, што, моў, важна ўбраць бульбу з «сваіх» вучасткаў, а бульбу з калгасных палёў убярэ, моў, рабочы з гораду. Гэтай спробе кулака распаліць улясьніцкія настроі сярод калгаснікаў, гэтай спробе кулака пасварыць нас з калгасьнікам трэба даць бязьлітасны адпор. Трэба мабілізаваць калгасьнікаў на перамогу ў барацьбе за бульбяны ўраджай. Трэба ў адказ на кулацкія манэўры ўзьняць калгасьнікаў для поўнага выхаду ў поле ўсёй калгаснай сям'ёй—ад старых да малых.

І адначасова неабходна арганізаваць сапраўдны бульбяны канвэйер з тым, каб бульба непасрэдна з палёў адвозілася-б да чыгункі. Гэта значыць, што неабходна больш пачыльна зьвязаць уборку з загатоўкай бульбы. Загатоўкі бульбы — надзвычайна адсталы участак. У гэтым выявілася апартуністычная недаацэнка ў многіх раёнах справы загатовак бульбы, няўменьне пабаявому, па-апэрацыйнаму наладжваць гэтую работу. Сам загатоўчы апарат у значнай ступені аказаўся слаба пад рыхтаваным. Найбольш выразна гэтая непадрыхтаванасьць выявілася ў тым, што ў адных раёнах застаюцца недапружанымі вагоны, ствараюцца прастоі вагонаў, а ў другіх не хапае вагонаў. Гэта найбольш выразна выявілася ў тым факце, што нават Наркамснаб сам блытаў загатоўкі, зьнімаючы загатоўкаў з адных раёнаў, перакідаючы іх ў другія і г. д. Гэта найбольш выразна выявілася ў няўменьні разгарнуць масавую палітычную работу на кол загатовак бульбы, у зусім дрэнзай рабоце Бесплодагароднінны.

Трэба зараз-жа рашуча перабудаваць ца. У нас засталося ўсяго толькі 10 дзён для скончэньня плянаў адгрузкі бульбы Ленінграду. У нас застаўся кароткі тэрмін для поўнага забясьпечаньня бульбай пралетарскіх цэнтраў БССР. Сёньняшнія тэмпы не гарантуюць перамогі.

Час не чакае! Халады сыгналізуюць набліжэньне зімы.

Узьняць тэмпы! Разгарнуць масавую работу! Арганізаваць бульбяны канвэйер — з бульбяных палёў да чыгункі! Мацней ударыць па кулаку і яго агентуры — правых і «левых» апартуністах! Выканаць плян уборкі бульбы і адгрузкі ня Ленінграду і гарадом БССР.

Манчжурскі вузел імпэрыялістычных супярэчнасьцяй--зацягваецца тужэй

Японскі імпэрыялізм не адступае ад сваей дабычы ў Кітаі

„Японія ніколі не пацерпіць умяшаньня ў манчжурскае пытаньне звонку...“

ТОКІЁ, 19-X. Тут атрымана паведамленьне аб тым, што Ліга Нацый мяркуе зьвярнуцца да Японіі з прапановаю даць абяцаньне эвакуаваць войска з Манчжурыі на працягу трох тыдняў, а таксама пачаць перамовы на працягу тыдня з удзелам у іх нэйтральных наглядачоў.

У сувязі з гэтым у колах міністэрства замежных спраў лічаць, што Японія ня можа прыняць ні першага, ні другога паказаньня Лігі Нацый па наступных матывах: 1) японскі ўрад разглядае эвакуацыю і перамовы як зусім розныя рэчы і ні ў якім выпадку ня можа згадзіцца са спробай Лігі зьвязаць іх, бо гэта адначала-б патрабаваньне аслабаненьня Японіі ўсіх пунктаў па-за зонай Паўднёва-Манчжурскай чыгункі.

Што датычыцца нэйтральных наглядачоў, то, праўда, гэткія ўдзельнічалі ў часе шаньдунскіх перамоў (гутарка ідзе аб перамовах, зьвязаных з акупацыяй Японіяй ў 1927 годзе Шаньдуня), аднак справа зараз абстаіць інакш. У адпаведнасьці з дэкларацыяй ўраду Танака, пасланай дзяржавам улётку 1927 году, «Японія ніколі не пацерпіць умешваньня ў манчжурскае пытаньне з вонку». Японія не жадае непадпарадкаў, падобна цяперашнім, якія пагражаюць жыцьцю японцаў і якія ў выпадку эвакуацыі войска будуць ня мінуча паўтарацца.

Праэкт дэкларацыі японскага ўраду

ТОКІЁ, 19-X. Учора адбылася нарада кіраўнікоў міністэрства замежных спраў, прысьвечаная абгаварэньню прапаноў Лігі Нацый ў сувязі з пактам Келёга. Гэта нарада прыйшла да аднадушнага рашэньня, што японскі ўрад павінен агалосіць дэкларацыю на ступшага зьместу: «Пакт Келёга ня можа быць ужыты, паколькі дзеяньні японскага войска ў Манчжурыі не зьяўляюцца ваеннымі дзеяньнямі, маючымі на мэце ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі, а служаць толькі мерай самаабароны.

Пакт Келёга прадугледжвае ўрэгуляваньне спрэчак мірнымі сродкамі. Японскае войска ў будучым ня мае намеру ўжываць ваенныя дзеяньні, калі японскі ўрад будзе ўпэўнен у тым, што пагроза яго прамадзянам і варожая абстаноўка ня будуць мець мес ца. Японскі ўрад патрабуе непасрэдных перамоў і спадзяецца ўрэгуляваць спрэчкі мірнымі сродкамі. Задача Лігі Нацый — заахвяціць абодвым бакам на неабходнасьць урэгуляваць пытаньне непасрэднымі перамовамі.

Аднак, можна пашкадаваць аб тым, што Ліга Нацый замест гэтага ставіць перашкоды для непасрэдных перамоў.

Знаходжэньне японскага войска па-за зонай Паўднёва-Манчжурскай чыгункі і разьвіцьцё мер самаабароны будуць працягвацца да той пары, на куль Японія не атрымае гарантыі ў безапаснасьці жыцьця японскіх грамадзян. Эвакуацыя ніякім чынам незьвязана з перамовамі, (уход японскага войска выклікаў-бы непарадкі, аб чым сьведчыць частыя забойствы карэйцаў».

Страты Японіі ў сувязі з антыяпонскім байкотам

ТОКІЁ, 20-X. Паводле даных японскай гандлёвай палаты ў Шанхаі, антыяпонскі байкот даў японскім дзелавым колам у Шанхаі 150 млн. таэлей страт (шанхайскі таэлей ў жніўні каштаваў 50 кап.).

У Шанхаі зачыніліся буйныя скураны, цукровы і алюміневы заводы, а таксама рад іншых буйных прадпрыемстваў, належачых японскай асацыяцыі прадпрыемцаў. Акроч таго ў Шанхаі зачынілася каля 50 дробных і сярэдніх японскіх прадпрыемстваў.

Амэрыка пачынае дзейнічаць супроць Японіі вайной... „незалежных“ кітайскіх урадаў

ТОКІЁ, 19-X. Японскае тэлеграфнае агенцтва «Дэнэу», паведамляе, што паводле вестак з Цзінчжоў штаб кітайскага войска і ўрад Чжан Сюэ-Ляна разьмясьціліся ў будынку ангела-амэрыканскай тытунёвай кампаніі.

Такім чынам заключае агенцтва, штаб мукдэнскага войска распрацоўвае ваенныя апэрацыі супроць японскага войска і арганізуе непарадкі ў Манчжурыі пад абаронай амэрыканскага сьцягу над будынкам. Японскае камандваньне ў Мукдэне пастанавіла расьледаваць гэты факт і ўжыць адпаведныя меры.

„Ліга Нацый н м выразных грапаноў“

ТОКІЁ, 19-X. У дакладзе рады міністраў Шыдэхара адзначыў, што японскі ўрад не атрымаў яшчэ адказу на тэлеграфнае запытаньне Брыяну адносна законнасьці запрашэньня прадстаўніка ПАЗШ да абгаварэньня японска-кітайскага канфлікту Лігай Нацый.

Практычна прадстаўнік ПАЗШ павінен толькі выказацца ў тым выпадку, калі будзе закранацца пакт Келёга. Па гэтаму Японія пярэчыць супроць запрашэньня прадстаўніка ПАЗШ да абгаварэньня Манчжурскага пытаньня. Рада Лігі Нацый ня мае выразных прапаноў па пытаньні аб урэгуляваньні японска-кітайскага канфлікту. Урад ПАЗШ растлумачыў, што калі рада Лігі Нацый ўжыве меры націску на Японію, дык ён ніколі ня прыме ўдзелу ў падобным акце».

„Новыя ўскладненьні“, або апрэданьне ачупацыі

ТОКІЁ, 20-X. Міністр (ваенны міністр Японіі) заявіў, што ў раёне Цзіньчжоў насьпяваюць «новыя ўскладненьні».

Цзіньчжоўскае войска будзе ўмацаваньні на рацэ Ляо, адпраўляюць разьведкі салдат на ўсходні бераг Ляо, пры чым салдаты перапрануты ў цывільную вопратку.

ТОКІЁ, 20-X. Прадстаўнік замежных спраў заявіў, што па-за зонаю Паўднёва-Манчжурскай чыгункі, у Мундэне знаходзіцца 400 японскіх салдат, у Гірыне каля 1700 салдат, у Сінміне — 400, у Гжэнлятуне каля 600.

У Чжандзуне і Андуне, на заяве прадстаўніка міністэрства замежных спраў, няма сталых японскіх гарнізонаў. Мае толькі месца «выпадковае зьяўленьне японскіх патрыляў».

Польская юстыцыя рыхтуе чарговую антысавецкую інсцэніроўку

ВАРШАВА, 20-X. У Варшаўскім апэляцыйным судзе прызначана да слуханьня справа Яна Палянскага, рабіўшага замах на паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР у Варшаве.

Баявое выступленьне сялян супроць паліцыі на Зах. Беларусі

ВАРШАВА, 20-X. «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны» паведамляе, што заканчэньня вёскі, дзе знаходзіцца маёнтак маршала Пільсудзкага, сяляне, узброеныя кольямі і дубінамі напалі на мясцовы паліцэйскі пастарунак. Сяляне былі разагнаны падасьпеўшым паліцэйскім падмацаваньнем. Праведзены шматлікія арышты. Паліцыя шукае скрыўшыхся ўдзельнікаў нападу.

Забастоўка пекароў у Лодзі

ВАРШАВА, 20-X. Абвешчана забастоўка пекараў у Лодзі. Прычынаю забастоўкі зьяўляецца спроба прадпрыемцаў навязаць рабочым 16-ці гадзінны працоўны дзень бяз усялякага падвышэньня зарплаты.

Клясавыя бані ў Нямеччыне

Адзіны фронт рэвалюцыйных рабочых з сацыял-дэмакратычнымі супроць фашыстаў —пашыраецца

БЭРЛІН, 20-X. Выступленьне нацыянал-сацыялісцкіх банд у Броўншвэйгу паскорыла працэс арганізацыі адзінага фронту рэвалюцыйных рабочых з сацыял-дэмакратычнымі праз голаву сацыял-фашысцкіх правадыроў.

Сацыял-дэмакратычныя рабочыя ў адзіным фронце з камуністамі, шляхам удзелу ў атрадах чырвонай самаабароны адбілі большасьць атак нацыянал-сацыялістаў на рабочыя раёны. Найбольш характэрным у антыфашысцкай барацьбе рабочых было цеснае яднаньне сацыял-дэмакратычных рабочых з камуністычнымі. У шмат якіх мясцох члены райхсбанэра (паўваенная арганізацыя «саюз рэспубліканскага сьцягу», знаходзячагося пад кіраўніцтвам сацыял-дэмакратаў), прымалі актыўны ўдзел у выступленьнях чырвонай самаабароны. Адзін атрад райхсбанэра прадставіў сябе ў распараджэньне чырвонай абароны. Адзіны антыфашысцкі фронт праявіўся тут з такой сілай, што назвал «Форвэртс» прымушан прызнаць, што «у шмат выпадках незалежна ад таго ці гэта члены райхсбанэра ці рот фронта, рабочыя сумесна адбівалі атакі «гітлераўскіх малайцоў».

БЭРЛІН, 20-X. У Броўншвэйгу працягваюцца налады нацыянал-сацыялістычных (фашысцкіх) банд на рабочае насельніцтва. Пры сутычках была цяжка паранена адна работніца. За апошнія два дні ў выніку сутычак паранена шмат рабочых. У Вольфэнбютэле (недалёка ад Броўншвэйгу) нацыянал-сацыялістамі забіты адзін рабочы, два нацыянал-сацыялісты цяжка паранены. Сацыял-дэмакратычнае кіраўніцтва вядзе, у сувязі з падзеямі ў Броўншвэйгу няпрыкрытую двурушніцкую палітыку. Кіраўніцтва паўваенай арганізацыі сацыял-дэмакратаў «рэйхсбанэр» агаласіла адозву аб падзеях у Броўншвэйгу, ацэньваючы іх як грамадзянскую вайну.

Адначасова «Форвэртс» спрабуе супакоіць масы, заўяляючы, што няма прычын непакоіцца, бо міністр унутраных спраў і міністр ваенных спраў Грэнэр зьяўляецца «нэйтральным» у адносіне да правых і аб'ектыўным да правых і «левых».

2-х месячник жывёлагадоўлі

Вопыт лепшых перадавікоў-у кожную МТФ і СТФ

Калгас „Расьсьвет Пераможа“ укамплектаваў СТФ на 150 проц.

За поўнае выкананьне плянаў камплектаваньня, за высокую таварнасьць жывёла адоўчых фэрмаў

Тэмпы двух раёнаў

Большасьць партыйных ячэек Жлобінскага раёну шчыльна падышла да вырашэньня задач разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Так, на прыклад, партячэйка калгасу «Расьсьвет Пераможца» першай у раёне аб гаварыла адозву ЦК і СНК аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі, мабілізаваўшы ўвесь калгасны актыў, камсамольскую ячэйку і радавых калгасьнікаў вакол задач ажыцьцяўленьня гэтай адозвы.

Трэба сказаць, што партыйна-камсамольская арганізацыя і калгасны актыў пабальшавіцку біліся за калгасны статак. Вынікі іх работы аказаліся бліскучыя, дзякуючы упартай рабоце, якая злучалася з гозгорнутай масавай работай, сярод калгасьнікаў, плян камплектаваньня значна перавыкананы.

Цяпер калгасны статак налічвае 300 сьвінаматак, замест вызначаных раёнам 200.

Тое-ж самае па сіласаваньні. Партячэйка рашуча, па баявому ўзялася за справу сіласаваньня. Камсамольцы калгасу разам з беспартыйнай моладзьдзю пад кіраўніцтвам ячэйкі аб весьцілі дзень сіласнага штурму ў калгасе. Гэта быў дзень рашучай барацьбы за магутную кармавую базу.

На 25 верасьня калгас засіласаваў 600 тон сіласу, перавыкананўшы намечаны плян на 10 проц.

Апроч таго, калгас «Расьсьвет Пераможца» мае яшчэ малочны статак, які налічвае каля 400 шт. буйнай жывёлы. На аборы ўведзена зьдзельшчына, правільна арганізавана праца.

Так, калгасьнікі «Пераможца» пад кіраўніцтвам сваёй партячэйкі, па баль шавіцку змагаюцца за калгасны статак. Рад калгасаў раёну («12 годзьдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі», «Чырвоная Зара» і інш.) выканалі пляны камплектаваньня на 140—170 проц. Камплектаваньне ў асноўным праходзіць за кошт закупкі і пазыкі сьвінаматак у калгасьнікаў, на добраахвотных пачках, шляхам разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і г. д.

Зусім адваротнае ва Ўраравіцкім раёне. Тут партарганізацыя яшчэ не мабілізавана на ажыцьцяўленьне задачы разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Большая палова калгасаў раёну яшчэ не абгаварыла звароту партыі і ўраду. У раёне існуе апартуністычная недаацэнка задачы разгортваньня сацыялістычнай жывёлагадоўлі, у выніку чаго замест павялічэньня, калгасны статак з кожным днём зьмяншаецца. Напрыклад, пры 14 проц. калектывізацыі бядняцка - серадняцкіх дваароў раёну, абапулены статак быў на 200 галоў большы, чым зараз, калі колькасьць гаспадарак уступіўшых у калгасы падвоілася. Усё гэта ёсьць просты вынік апартуністычнай недаацэнкі сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Ёсьць рад фактаў, калі кулакі вядуць работу па забою жывёлы, асабліва ва маладняка (в. Івельск, Глазоўка, Чабатовічы), між тым, ні партячэйкі, ні сельсаветы належных мер ня прымаюць. Досыць зазначыць на тое, што ў сучасны момант амаль ніякай работы вакол звароту ЦК і СНК сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў не праводзіцца, а кулак робіць сваю справу, падрываючы камплектаваньне калгаснага статку і арганізацыю МТФ і СТФ.

Раўнаючы работу гэтых дзьвёх партыйных арганізацый, Жлобінскай і Ўраравіцкай, — трэба адзначыць, што калі многія калгасы Жлобінскага раёну ня толькі выконваюць, але і перавыконваюць пляны камплектаваньня статку, дык ва Ўраравіцкім раёне, ў выніку апартуністычнай недаацэнкі дырэктыў партыі ў галіне разгортваньня работы па камплектаваньні статкаў, толькі 2—3 калгасы раёну набліжаюцца да выкананьня пляну камплектаваньня сьвіньі і малочных фэрмаў.

Зусім відавочна, што правыя апартуністы — кулацкія агенты ў радзе ячэек Ураравіцкага раёну зрываюць справу стварэньня калгасных таварных фэрм. Толькі рашучая барацьба з кулаком і яго агентурай, мабілізацыя ўсёй партарганізацыі, усіх сельсаветаў і самих калгасьнікаў могуць прывесьці гэты раён да перамогі.

Е.

Тав. ДЫМКОВА, ударніца-сьвінарка саўгасу «Вусьце» (Аршанск. раён).

Скарыстаць вопыт работы саўгасу „Райцы“

ТАЛАЧЫН. Саўгас «Райцы» зьяўляецца сьвіноваднай гаспадаркай, якая паводле прамфінпляну да 1 студзеня 1932 г. павінна мець 1400 штук сьвіноматак і пагалоўя, з іх 200 сьвінаматак, 13 кныроў, 1187 галоў маладняка.

Па становішчы на 10 кастрычніка ў саўгасе ёсьць толькі 150 сьвінаматак, кныроў 12 і маладняка 722, а ўсяго 884 гал., што складае 63,1 проц.

За час з 1 кастрычніка было апаросаў 132, сярэдні выхад парасят ад аднэй сьвінаматкі 9,5 штук і ад'ёмшчыкаў 5,5 штук.

Дагляд за сьвіньнямі і маладняком у апошні час значна палепшыўся.

З мая саўгас поўнасьцю перайшоў на зьдзельна - прэміяльную аплату працы, ліквідаваў абязьлічку, дзякуючы чаму сярод рабочых сьвінароў разгорнута барацьба за колькасныя і якасныя паказьнікі. Вось прыклад: малодшая сьвінарка Цяркова ў жніўні аб слугоўвала 260 ад'ёмшаў, замест вызначанай нормы 110 і атрымала замест 36 руб. стаўкі, за колькасныя і якасныя паказьнікі—96 руб.

Сярэдняя зарплата ўсіх сьвінарак у параўнаньні з мінулымі месяцамі павысілася на 30—35 проц.

Сацыяборніцтва і ўдарніцтва ў племсьвінгасе шырока разгорнута, у выніку чаго значна паменшыўся адыход маладняка замест 44,6 проц., з студзеня па май месяц, зьнізіўся да 23 проц., з мая па кастрычнік. Але ў выніку нескончэньня будаўніцтва сьвінарнікаў у тэрмін, маладняк стаіць у цеменаце. Бу даўніцтва сьвінарнікаў у саўгасе выканана толькі на 75 проц.

Саўгас уключыўся ў 2-х месячнік агляду сацжывёлагадоўлі. Рабочы саўгасу, рабачком і адміністрацыя абавязаліся закончыць будаўніцтва ўсіх сьвінарнікаў да 1 лістапада 1931 г. і кухню да 15 лістапада, таксама прыняты рад абавязацельстваў у галіне вы каканьня прамфінпляну і 100-процантнае захаваньне маладняка.

Саўгас мае стада буйнай рагатай жывёлы для задавальненьня патрэбы бочых і маладняка сьвіней.

Прамфінплян па ўкамплектаваньні буйнай рагатай жывёлы перавыкананы.

Прамфінплян па малочнай прадукцыі за 8 месяцаў выкананы на 119 пр. гадавога заданьня і па масьле 205 проц.

У 2-х месячнік жывёлагадоўлі саўгасы і калгасы павінны шырока скарыстаць вопыт саўгасу «Райцы».

Селькор.

Племсправу—у рамкі плянавасьці

Пытаньне палепшаньня якасьці і падвышэньня прадукцыйнасьці жывёлы павінна зьяўляцца першачарговым абавязкам кожнага скотніка, конюха, сьвінара, птушніка і ўсяго зоатэхнічнага вэтэрынарнага персаналу. Гэты ніжэйшы і вышэйшы камандны склад сацыялістычнай жывёлагадоўлі ў штодзённай працы можа знайсьці шмат практычных шляхоў, якія дапамагілі бы хутчэйшаму вырашэньню пытаньня палепшаньня жывёлы.

Каб мець у нашых саўгасах і калгасах чыста пародную і высокапрадукцыйную жывёлу, трэба ў першую чаргу, зьвярнуць увагу на арганізацыю племсаўгасаў і племкалгасаў, у якіх неабходна сканцэнтраваць усю лепшую пляменную жывёлу і гэтыя саўгасы і калгасы зрабіць сапраўднымі расплоднікамі высокапрадукцыйнай племяной жывёлы, і ўзорнымі жывёлагадоўчымі гаспадаркамі, як па ўтрыманьні, кармленьні і доглядзе так і па атрымліванай валавой і таварнай прадукцыі.

Племсправай ў БССР да гэтага часу амаль не займаліся, калі ня лічыць таго, што неяк былі вылучаны племсаўгасы па лініі Белсаўгастрэста, якія ў гэтым напрамку нічога не зрабілі, а толькі патрабавалі датацый ад дзяржавы.

У зьвязку з правадзімай сацыялістычнай рэканструкцыяй жывёлагадоўлі на базе арганізацыі буйных жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм, племянная справа і правільнае выкарыстаньне і выбару пародаў для БССР.

Глушакоў.

Напярэдадні франко-амэрыканскіх перагавораў

Ад'езду Лаваля ў Вашынгтон папярэдзала надзвычайна вялікае ажыўленьне ў колах сусьветнай фінансавай алігархіі. Два дырэктары французскага банку ўжо знаходзяцца ў Нью-Ёрку, дзе яны вядуць перагаворы са старшынёй федэральнага банку. Віцэ-дырэктар федэральнага рэзэрвовага банку Бэрджэс вёў у Базэлі перагаворы з кіраўнікамі важнейшых эмісійных банкаў і ў прыватнасьці са старшынёй французкага банку Морэ. Сам Морган быў у Парыжы і вёў перагаворы з Лавалем. Адначасова з Лавалем у Вашынгтон прыбудуць кіраўнікі нямецкай гаспадаркі і важнейшыя ангельскія банкіры.

Крэдытны крызіс ахапіў увесь капіталістычны сьвет. Падвышэньне вучотнай стаўкі адбываецца ва ўсіх капіталістычных краінах, у тым ліку ў ПАЗШ і ў Францыі, штурм банкаў, вы няцьце ўкладаў з банкаў і кас ашчадносьці, агульнае імкненьне абярнуць паперовыя тропы ў золата, затойваньне звычкай манэты і золата нават у ПАЗШ і Францыі — у краінах, дзе грашовая сыстэма пакуль яшчэ не пахіснулася, і нарэшце, банкроцтва буйных банкаў характарызуюць наступленьні ход крэдытнага крызісу.

Крэдытны крызіс, з свайго боку, паглыбляе і абвастрае крызіс прамысловы і аграрны. Масавыя банкруцтвы заначаюць пагібель тысяч дробных і буйных прадпрыемстваў. Скарочаньне крэдыту вымушае нават буйныя манапалістычныя аб'яднаньні разбазарваць свае таварныя запасы. Абясцэньваньне валюты ў радзе краін, а ў асабліваасьці ў Англіі, азначае, што скарочваецца ня толькі зарплата, але і даходы паразітычнага пласта-рантье. Пад уціскам крэдытнага крызісу паскоры ся працэс падзеньня цэн на вырабы манапольных галін вытворчасьці. Крэдытны крызіс вядзе да скарочаньня вытворчасьці і росту беспрацоўя.

Ад Гільфардынга да Лаваля і ад Макданальда да Гувэра ўсе дзяржаўныя дзеячы буржуазнага сьвету ляманцуюць аб «крызісе давер'я». Крызіс да браўся да камандных вышынь манапалістычнага капіталізму, да буйных і буйнейшых банкаў, да буйных і буйнейшых манапалістычных аб'яднаньняў. Паніка, пасьмізм, сумны настрой і недавер'е да сваёй ўласнай гасподарчай сыстэмы ахапляюць ідэолёгаў буржуазіі, прасякаючы ў шырокія дробна-буржуазныя пласты.

Якія пытаньні будуць пастаўлены пры Вашынгтонскіх перамовах?

Можна ня сумнявацца ў тым, што ў першую чаргу там будзе пастаўлена пытаньне аб рэпарацыях і міжсаюзных ваенных даўгох.

Можна ня сумнявацца ў тым, што Лаваль і Гувэр будуць весьці перамовы аб адтэрміноўцы плацяжоў па рэпарацыйных і даўговых абавязацельствах. Францыя пры гэтым захоча выторгаваць для сябе не абароненую часьтку нямецкіх рэпарацыйных плацяжоў на суму ў 100 мільёнаў даляраў у год.

Опатканьне Лаваля і Гувэра можа стварыць глебу для рэалізацыі раду камбінацый, якія зараз падрыхтоўваюцца ў лягеры імпэрыялізму. Вашынгтонскія перамовы могуць стварыць поўную падставу для французска-нямецкага «зблізіваньня», г. зн. для паскоранага капітуляцыі нямецкай буржуазіі перад французскай. Можна ня сумнявацца ў тым, што ў часе Вашынгтонскіх перамоў будуць закрануты пытаньні, якія надзвычайна блізка датычацца ўзаемаадносін паміж СССР і капіталістычным сьветам. Няма ніякага сумненьня, што супярэчнасьці паміж ПАЗШ і Францыяй, набыўшыя асабліва востры характар за апошні пэрыяд, ня будуць аслаблены перамовамі.

Вашынгтонскія перамовы прадстаўляюць спробу міжнародняй буржуазіі паставіць і вырашыць хоць-бы некаторыя пытаньні з тых, якія высунуты сусьветным эканамічным крызісам. Але ў той-жа час гэтыя перамовы ня могуць ня стаць пачаткам новага абвастрэньня міжнародных супярэчнасьцяй, пачаткам важных зрухаў ва ўсіх міжнародным становішчы. Гэтыя перамовы заслугоўваюць таму пільнай увагі з боку міжнароднага пралетарыяту.

(З перадавой «Правды» па радыё).

АНТЫ-ЯПОНСКІ РУХ ШЫРЭЦЦА

ШАНХАЙ. Сярод кітайскага насельніцтва Шанхаю панае вялізарнейшая трывога. Працягваюць распаўсюджвацца самыя сенсацыйныя чуткі, нібы нанкінск урад накіраваў буйныя атрады пад вёдам неабходнасьці аказаць супрацьўленьне спробам японцаў высадзіць дэсант на кітайскай тэрыторыі. Судзячы па ўсім антыяпонскі рух працягвае разрастацца.

***

ШАНХАЙ. Японскае тэлеграфнае агенцтва «Дэмпа Цусін» умацнена распаўсюджвае паведамленьне аб нападзе кітайскіх ваенных атрадаў па розных пунктах на паўднёва-Манчжурскай і Бэйпін-Мукдэнскай чыгунцы. У гэтыя раёны высланы японскія вайсковыя самалёты «на разьведку».

БА ПРАЦЯГВАЮЦЦА

ТОКІЁ. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун-Рэнга з Мукдэну японскае войска вядзе баі супроць тысячы «бандытаў» у раёне Сінмінтына (станцыя Бэйпін-Мукдэнскай чыгункі), за 10 міль ад Мукдэну.

III усебеларускі зьезд навуковых працаўнікоў

ЗА РАШУЧЫ ПАВАРОТ НАВУКІ

да сацыялістычнай вытворчасьці

«Толькі сацыялізм вызваліць навуку ад яе буржуазных путаў, ад яе падняволеньня капіталу, ад яе раства перад інтарэсамі орудняй капітал стычнай карысьлівасьці»

Ленін

За работу па-новаму

З уступнай прамовы старшыні ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў БССР т. Вальфсона, на адкрыцьці зьезду

3-ці Усебеларускі зьезд навуковых работнікаў зьбіраецца ў абставінах, калі асаблива абвострылися супярэчнасьці 2-х сусьветных гаспадарчых і культурных сыстэм.

Сьвет эксплёатацыі, які знаходзіцца ў абцугох нячуванага крызысу, з яго 40 мільёнамі беспрацоўных, перапоўнены турмамі з паліцэйскімі органамі, з яго вайсковымі авантурамі і бязупынная правакацыяй новай імпэрыялістычнай бойні, з узьнімаючайся рэвалюцыйнай хваляй і сьвет пераможнага пролетарыяту, які ліквідуе драпежнікаў і паразітаў, сьвет працоўнага энтузіязму дзесяткаў мільёнаў, бурнага ўздыму падукцыйных сіл, вялізарнага будаўніцтва, сьвет будуючагася сацыялізму.

Кожны з гэтых дзьвюх сьветаў мае навуку, якая яму адпавядае.

Там, у капіталістычным сьвеце, навука знаходзіцца на залатым ланцугу капіталу, апутаная патэнтамі, манаполіямі, сакрэтамі трэстаў. Там, — навука ўсё мацней заграбае ў містыцы і мракабесьсі, цынічна на скідаючы з сябе мантыю нежлі савасьці і апалітызму. Там—навука ўсё больш адкрыта прыслужвае імпэрыялістычным гаспадарам.

Тут, у нас, у краіне пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва, навука асьвятляе мільёнам працоўных іх шлях барацьбы за лепшую будучыню. У нас, навука, перастае быць здабыткам касты вучоных мандарынаў і робіцца здабыткам шырокіх мас. Тут адбываецца грандыёзная рэканструкцыя ўсёй навукі на грунце ліквідацыі прарыву паміж тэорыяй і практыкай, унясенне яе ў яе плянавасьці і калектыўнасьці, на базе мэтадалёгіі марксызму-ленінізму.

Папярэдні зьезд наш выбраўся каля 3-х год таму назад. Мы мелі тады 4 ВНУ, зараз маем—26. Мы мелі тады 7 НДУ, зараз маем — 39. У нашых радох было тады 400 членаў, зараз амаль—1200.

А ці не зьяўляецца паказьнікам тэмпаў нашага росту, нашых дасягненьняў тое, што будынак, у якім зараз сабраўся наш зьезд, знаходзіцца на месцы на якім у часе другога зьезду быў пусты пляц, пакрыты штабелямі дроту.

Наш зьезд закліканы паказаць тыя вялікія дасягненьні, якія мы маем на фронце навукі і вышэйшай школы, дасягненьні тым больш значныя, калі ўспомніць становішча разгрому, уціску і прыпнечаньня, у якім знаходзіцца беларуская культура пад уладай польскага фашызму. Мы са здаволеньнем можам сказаць, што прыходзім на зьезд, маючы асноўную масу навуковых работнікаў БССР, згуртаваных на барацьбу за шырачэзнае ажыцьцяўленьне сацыялістычнага будаўніцтва на грунце генэральнай лініі партыі. Мы з радасьцю можам сказаць, што ў нашых радох ужо знаходзяцца значныя атрады таварышоў, якія ўступаюць на арэну навуковай работы, якія ў большасьці прадстаўляюць тую вытворча-тэхнічную інтэлігенцыю рабочае клясы, стварэньне якой дыктуецца ўсёй нашай сучаснасьцю і дырэктыўнымі паказаньнямі тав. Сталіна.

Нашы ВНУ і НДУ ўсё больш рэальна робяцца апорнымі пунктамі беларускай пралетарскай культуры, фабрыкамі кадраў пралетарскіх спэцыялістаў, магутнымі рычагамі ўздыму гаспадаркі і культуры БССР на новую больш высокую ступень.

Але тое, чаго мы ўжо дамагліся, вельмі мала ў параўнаньні з тымі вялізарнымі задачамі, якія стаяць перад намі ў пэрыяд уступленьня ў сацыялізм, на пароге другой пяцігодкі.

У нашай вытворчасьці яшчэ шмат недахопаў, шмат прарываў.

Мы яшчэ далёка не разгарнулі плянаваньне нашай навукова - дасьледчай справы і часта не забясьпечваем рэалізацыю ўжо распрацаваных плянаў. Мы не дамаглися яшчэ неабходнага ўдзелу ўсяе масы навуковых работнікаў усёй навуковай грамадзкасьці ў галоўных галінах навукова-дасьледчай работы. Наша прафэсыянальная арганізацыя яшчэ занадта слаба павярнулася тварам да вытворчасьці. У нашых ВНУ і НДУ яшчэ гаспадарыць урабэнілаўка і абязьлічка.

Наш зьезд таму закліканы ня толькі дэманстраваць нашы дасягненьні, назіраўшасьці і значэньне якіх бясспрэчны. Ён закліканы так сама пражэктарам бальшавіцкай крытыкі і самакрытыкі асьвятліць усё, што ёсьць слабага і адмоўнага як у нашай вытворчасьці, так і ў нашым сэкцыйным жыцьці.

Няхай лёзунгам нашага зьезду будуць словы апошняй адозвы УсеЦСПС: **«прафсаюзы павінны разгарнуць бязьлітасную пралетарскую крытыку ўсіх недахопаў сваёй работы і дабіцца іх зьнішчэньня».**

Няхай наш зьезд будзе зьездам цалкам накіраваным тварам да задач вытворчасьці. Паставім яго работу пад знак барацьбы за ўкараненьне 6 сталінскіх умоў у нашу вытворчасьць, у навуковы і навучальны працэс.

Зробім нашу зьезд зьездам абгаварэньня аб'яднаньнямі сілам усёй нашай навуковай грамадзкасьці та го, як мы павінны ўкараняць у быт і жыцьцё вышэйшай школы гі старычныя пастановы ЦК УеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб масавай школе.

Няхай наш зьезд дасьць магутны штуршок вырашэньню найбольш важных праблем вышэйшай школы і навукова-дасьледчай справы ў БССР. Няхай ён будзе зьездам адданых справе пралетарскай рэвалюцыі, справе рабочае клясы, справе партыі будаўнікоў сацыялізму.

На зьезьдзе

20-га кастрычніка, а 8-й гадзіне ўвечары, ў актавай залі БДУ адкрыўся 3-ці Усебеларускі зьезд навуковых работнікаў.

Адкрываючы зьезд з вялікай прамовай выступіў старшыня ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў БССР тав. Вольфсон.

У прэзыдыум зьезду абраны: т.т.: Чарнушэвіч, Рыжоў, Горын, Платун, Вольфсон, Грысевіч, Рыўлін, Бэнэк, Ленц, Нікольскі, Пераход, Плятнёў, Бамэль (ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў СССР) і інш.

У ганаровы прэзыдыум абраны: па літбюро ЦК УсеКП(б) і т.т. Тэльман, Ленскі, Гей, Шаранговіч і Галадзед.

Абраўшы прэзыдыум зьезд адразу прыступіў да дзелавой часткі работы і заслухаў даклад тав. Бамэля аб рабоце ЦБ сэкцыі навуковых работнікаў СССР.

Пасьля дакладу тав. Бамэля зьезд віталі прадстаўнікі заводу Варашылава, друкарні імя Сталіна, падшэфнага сэкцыі калгасу «Чырвоны Партызан» і падшэфнай часьці Чырвонай армії.

Учора, 21-га, на ранішнім паседжаньні зьезду пачалися спрэчкі па дакладу тав. Бамэля.

На гэтым - жа паседжаньні зьезд віталі прадстаўнік БелМБІТ-у тав. Кулькін і дэлегацыя першага зьезду спэцыялістаў саюзу МТС і батрацтва, які зараз праходзіць у Менску.

На прывітаньні адказваў тав. Верын (Віцебскі вэтэрынарны інстытут).

У спрэчках па дакладзе тав. Бамэля прынялі ўдзел т.т. Верын (Віцебск), Пракапчук, Бабраўніцкі (Горкі), акадэмік Замошін, дацэнт Вертко, прафэсар Выдра, прафэсар Гаўсман, акадэмік Кроль, прафэсар Боднеў, прафэсар Папоў і іншыя, усяго 25 чалавек.

Загад па Народнаму Камісарыяту Асьветы БССР ад 18-X 1931 году

1. Надаць годнасьць прафэсара наступным т. т.

Дацэнт Рыўліну У. У.—годнасьць прафэсара па катэдры гісторыі Захаду.
" Югаву С. С.—годнасьць прафэсара па катэдры гісторыі народаў СССР.
" Усьпенскаму Я К.—годнасьць прафэсара па катэдры фізыкі.
" Дыдырка У. К. " " " матэматыкі.
" Чэрвякову Б. Ф. " " " судовай медыц.
" Міршаку Е. Л. " " " сухоты.
" Маркаву Л. А. " " " фізіатрыі.
" Ермоленка Е. Г. " " " агульнай, фізычнай і калёіднай хэміі.
" Пракапчуку А. Я. " " " скурна - вэнэрычных хваробах.

2. Зашь ерадніць дацэнтамі наступных т. т.

Асыстэнта Кагана Л. І.—дацэнтам па катэдры палітэканоміі.
" Дардака Ю. " " педагогікі і педалёгіі.
" Пэлеп М. Я. " " фізыкі.
" Зубковіч Я. П. " " біоэнергіі.
" Шкодзіна Ф. Л. " " тэхналёгіі мэтал
" Казлова А. А. " " педалёгіі.

Народны Камісар Асьветы ПЛАТУН.
Кіраўнік справамі РУБІНЧЫК.

За бесьперабойнае фінансаваньне сацбудаўніцтва

ВЫКАНАЦЬ ПАСТАНОВУ УРАДУ

аб арганізацыі паказальных ашчадкас

Да XIV гадавіны Кастрычніка павінны быць арганізаваны паказныя ашчадкасы ў кожным горадзе і раёне. Завод імя Варашылава, фабрыка імя Куйбышава і Менская кушняровая фабрыка—перадавыя змагары ў мабілізацыі сродкаў

Арганізаваць паказальныя ашчадкасы

Асноўная задача ўскладзеная на ашчадкасы—задача мабілізацыі вольных сродкаў насельніцтва, фыкарыстаньне зьберажэньняў на сацыялістычнае будаўніцтва, зараз ашчадкасамі ажыцьцяўляецца нездавальняюча.

Плян 1931 г. па ўкладах выконваецца ў недапушчальнай слабай ступені (25 проц.); у зьвязку в гэтым мы маем вельмі высокую каштоўнасьць для дзяржавы капіталаў прыцягваных праз ашчадкасы і нерэнтабэльнасьць ашчадкас, асабліва сельскіх.

Бязумоўна, што пры рэальнасьці пляну 1931 г. прычынай гэтага становішча зьяўляецца недастатковая актыўнасьця самога ашчаднага апарату, які ў значнай частцы спадзяецца на самацёк, адсутнасьць сыстэматычнай масавай працы па прыцягненьні ўкладчыкаў і сродкаў і недастатковы ўдзел і дапамога в боку мясцовых органаў і грамадзкіх арганізацый.

Ня лепш абстаіць справа і з другой задачай ашчадкас—касавым абслугоўваньнем патрэб працоўных. Факты цяганіны, бюракратычных адносін да кліентуры, недабраякаснага абслугоўваньня ўкладчыкаў, несваячасовага выкананьня даручэньняў, наяўнасьць чаргі ў асноўных касах—ўсё гэта сьведчыць аб неабходнасьці рашучага зруху ў справе найбольшага прыстасаваньня працы ашчадкас да патрабаваньняў працоўнай масы.

Трэба адзначыць, што важнейшыя рашэньні Саюзнага Ураду ад 1-II і СНК БССР ад 3-III г. г. па пытаньні разьвіцьця ашчадправы праводзяцца ў жыцьцё вельмі слаба, а асобныя пункты зусім ня выконваюцца. Так пастановай ураду прапанована Гарсаветам і РВК вылучыць у кожным раёне па адным перадавым прадпрыемстве (альбо саўгасу ці калгасу) для арганізацыі пры ім паказальнай ашчадкасы. Паказальныя ашчадкасы павінны паводле дэкрэту Ураду стаць узорамі належнай працы па мабілізацыі сродкаў і абслугоўваньні працоўных.

На справе-ж у БССР няма ніводнай паказальнай ашчадкасы. Намінальна паказальныя касы выдзелены ў асобных раёнах (Віцебск, Рэчыца, Бабруйск, Бягомль), але-ж па сутнасьці паказальнага ў іх нічога няма.

Правадзімая зараз у БССР фінэстафэта павінна даць зрух і ў гэтай справе. Неабходна каб кожны Гарсавет і РВК зараз-жа рэалізавалі пастанову аб паказальных ашчадкасах і разам з райашчадкасамі забясьпечылі арганізацыю адной паказальнай ашчадкасы ў кожным горадзе і раёне. У гарадох паказальныя ашчадкасы павінны ў першую чаргу быць арганізованы на прадпрыемствах, шэфствуючых над фінансава-крэдытным апаратам (па прыкладу з-ду «Варашылава» у Менску). На вёсцы паказальныя касы павінны быць створаны ў больш буйных саўгасах, калгасах, паштовых установах, альбо самастойныя.

Паказальным ашчадкасам павінны быць забясьпечаны належныя ўмовы для працы: кваліфікаваныя і грамадзка падрыхтаваныя работнікі, абсталяваньне памяшканьне, актыўная праца камісій садзейнічаньня і грамадзкіх інструктароў, нагляд і дапамога з боку мясцовых савецкіх органаў, стварэньне сталага актыву вакол ашчадкасы.

Задача зусім рэальная, трэба толькі ўзяцца за яе практычнае ажыцьцяўленьне. Тады прыслады лепшай працы можна будзе перадаць усёй сыстэме ашчадкас і дабіцца ўзмацненьня і палепшаньня працы, з мэтай пераўтварэньня ашчадкас у магутную масавую крэдытную арганізацыю.

Да XIV-й гадавіны Кастрычніка паказальная ашчадкаса павінна быць арганізована ў кожным горадзе і раёне.

М. Полеес.

Шырока выкарыстаць вопыт рабочых заводу імя Варашылава і шоўкавай фабрыкі імя Куйбышава

Праходзячая фінэстафэта дала свае станоўчыя вынікі ў радзе прадпрыемстваў у выкананьні фінпляну. Так, на заводзе імя Варашылава фінармейцы дабіліся 100 проц. ахопу пазыкай 3-га дабіліся 100 проц. ахопу пазыкай 3-га рашаючага году пяцігодкі, усе работчыя выяўляюцца ўкладчыкамі ашчадных кас, ахоплены калектыўнымі і індывідуальным страхаваньнем жыцьця. Рабочыя заводу імя Варашылава ўзялі на грамадзкі буксір заводы «Камунар» і «Дрэваапрацоўшчык» у мабілізацыі сродкаў. Дзе таксама дабіліся сапраўднага зруху ў мабілізацыі сродкаў. На гэтых заводах усе рабочыя і служачыя ахоплены пазыкай, выдаюцца ўкладчыкамі ў ашчадкасы, ліквідаваны запазычанасьць па камунальных паслугах і г. д.

Па прыкладу рабочых заводу імя Варашылава Менская скарняжная фабрыка ўзяла на грамадзкі буксір у выкананьні фінпляну фабрыку 8-га сакавіка» дзе таксама ліквідаваны прарыў у выкананьні фінпляну.

Рад фабрык і заводаў абгаварылі адозву заводу «Варашылава» зьвярнуліся з такой-жа адозвай да рабочых і служачых свайго раёну (Шоўкавая фабрыка імя Куйбышава ў Магілёве, завод «Хаўтурына» у Бабруйску), і ўключыліся ў фінэстафэту ўзяўшы на сябе рад абавязацельстваў забясьпечваючых выкананьне задач фінансавага фронту.

Рабочыя, служачыя і тэхнічны персанал шоўкавай фабрыкі імя Куйбышава арганізавалі штаб па правядзеньні сапраўднага кантролю над шэфствуючымі фінансава-банкаўскімі ўстановамі, вылучылі 50 сацумшчальнікаў у фінбанкаўскую сыстэму. Апроч гэтага ўзялі на буксір 10 адстаючых прадпрыемстваў. Магілёўшчыны ў выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў і вылучылі 30 рабочых у сельсаветы для аказаньня дапамогі мясцовым арганізацыям у мабілізацыі сродкаў. Яны абавязаліся на працягу кастрычніка месяца ахапіць па гэтых сельсаветах усе насельніцтва пазыкай.

Фінэстафэту павінны падхапіць усе фінансавыя гарадзкія і раённыя арганізацыі што дасьць карэнны пералом у выкананьні плянаў мабілізацыі сродкаў.

Першая дэкада 4-га кварталу ў выкананьні фінпляну сыгналізуе аб небясьпечным становішчы. Большасьць раёнаў БССР дала ганебныя паказьнікі ў выкананьні фінпляну. Некаторыя раёны месячнае заданьне па ўкладах у ашчадныя касы выканалі ўсяго на 1,3 проц., па зваротах сельгасабавязацельстваў—4,1 проц., акцыяў Трактарацэнтру на 2,4 проц. і г. д.

Гэтыя паказьнікі сьведчаць аб тым, што ня ўсе яшчэ саюзныя арганізацыі падхапілі вопыт чырвонасьцяжнага заводу імя Варашылава ў правядзеньні фінансавай эстафэты ганебна адстаюць фінансавыя арганізацыі.

Цэнтральнаму штабу пры НКФ па правядзеньні фінэстафэты неабходна перад сабой паставіць задачу сыстэматычна і апэрацыйна кіраваць усімі раённымі штабамі і фінармейцамі працуючымі ўжо на фабрыках і заводах установах, калгасах і сельсаветах. Неабходна арганізаваць апэрацыйныя пасты па правядзеньні фінэстафэты на мясцох з тым каб мець магчымасьць своячасова рэагаваць на маючыяся прарывы ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў.

Кайкоў.

Бабруйскі райспажыўсаюз зрывае мабілізацыю сродкаў

9,3 проц. выкананьня фінпляну за першую дэкаду кастрычніка па Бабруйскім раёне сьведчыць аб значным прарыве. Апартуністычныя адносіны і стаўка на самацёк усё яшчэ перашкаджаюць разгарнуць на бальшавіцку выкананьне фінпляну.

Рад арганізацый недапушчальна абідна адносяцца да мабілізацыі сродкаў. Так напрыклад, райкалгасасаюз акцый Трактарацэнтру рэалізаваў толькі на 1,2 проц. квартальнага заданьня; райспажыўсаюз па зборы паёў выканаў квартальнае заданьне на 0,1 проц., а па арганізацыі мэтавых укладаў зусім нічога не зрабіў. Ня лепш абстаіць справа і па райашчадкасе: па фіз. укладах па горадзе адлёг складае 16000 руб., а па вёсцы прылёг 0,4 проц., альбо 52 руб.

Вельмі дрэнна абстаіць справа з касавымі паступленьнямі па пазыцы 3-га рашаючага году пяцігодкі, асабліва на вёсцы. Так, па Міхалёўскім сельсавеце паступіла ўсяго 5 проц., Рэмавецкім —2 проц., Сычкаўскім—8,6 проц. Гэтыя лічбы яшчэ раз падкрэсьліваюць, што як раённыя, такі мясцовыя арганізацыі не зварочваюць належнай ўвагі на вёску.

Толькі гэтымі днямі РПС і Райфа ўбачылі прарыў на вёсцы, склікалі нараду арганізацый раёну праводзячых работу па мабілізацыі сродкаў, і мабілізавалі таварышоў па сельсаветах на ліквідацыю прарыву.

Характарна адзначыць, выступленьне т. Ерынбурга (райспажыўсаюз), які на нарадзе заявіў: «мы сьвядома ня зьбіралі мэтавых укладаў таму, што тавараў няма, дык няма чаго і грошай зьбіраць». Гэтаму кулацкаму агенту тут-жа далі належны адпор.

З пералічаных прыкладаў відаць, што кіраўніцтва райспажыўсаюзу не забясьпечвае правільнага кіраўніцтва ў рабоце з апартуністычна адносіцца да сваёй работы. Такое кіраўніцтва павінна быць зьнята, яно ня бачачы сваіх прарываў хаваецца пад шыльдай кулацкіх разважаньняў.

Удзельнікі нарады далі абяцаньне ліквідаваць прарыў, шырока разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва і на гэтай аснове дабіцца перамогі на фінансавым фронце.

Пархоменка.

У Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Пра забясьпячэньне прадпрыемстваў рабочай сілай

20 кастрычніка камісія выкананьня заслухала даклад Наркампрацы БССР аб выкананьні пляну забясьпячэньня народнай гаспадаркі рабочай сілай. За першае паўгодзьдзе гг. праграма забясьпячэньня рабсілай выканана на 95,5 проц. Па прамысловасьці ВСНГ праграма выканана на 96 проц. і па Наркамснабу на 91,5 проц. Значнае недазабясьпячэньне рабсілай чыгуначнага будаўніцтва, дзе праграма выканана на 59,5 проц. і Белсельбуду—на 68 проц.

Барацьба з цякучасьцю рабсілы была ўзьнята на належную вышыню, па прамысловасьці ВСНГ за першае паўгодзе цякучасьць рабсілы дасягала —41,9 проц. Забясьпячэньне прамысловасьці жаночай рабсілай сарвана, замест 20 проц. выканана — 6,2 проц.

Недавыкананьне праграмы вярбоўкі рабочай сілы тлумачыцца тым, што Наркампрацы і яго арганізацыі не пераключылі сваю работу на хутчэйшую рэалізацыю паказаньняў тав. Сталіна ў гэтым пытаньні. Няма дакладнага вучоту наяўнасьці і патрэбнасьці рабочай сілы. Няма сталага прымацаваньня раёнаў да гаспадарчых арганізацый. Былі выпадкі калі нарады на вярбоўку рабсілы ў раёне давалися двум арганізацыям і бяз улику наяўнасьці там рабочай сілы. У выніку здарылася, што ў некаторых галінах прамысловасьці рабочай сілы не хапала, а ў іншых былі лішкі. Калі на будаўніцтве і ў прамысловасьці Наркам снабу ёсьць значны недахват рабочай сілы, дык у швэйнай прамысловасьці ёсьць рабсілы 19 проц. звыш праграмы.

Заключэньне дагавароў гаспадарчых арганізацый з калгасамі не ажыцьцяўляецца. Да гэтае пары заключаны дагаворы толькі па лініі Галоўдортрансу і Белсельбуду. Аб выкананьні дагавароў Наркампрацы ня ведае, бо кантролю няма. Гаспадарчыя арганізацыі не ўявілі сабе палітычнай сутнасьці за бесьпячэньня прамысловасьці рабочай сілай арганізаваным парадкам, лічачы што за адсутнасьць рабочай сілы адказвае выключна Наркампрацы. У выніку сярод гаспадарчых арганізацый і калгасаў адсутнічае цесная сувязь і ўзаемная дапамога.

Для прапрацоўкі раду мерапрыемстваў па дакладзе вызначана камісія.

Кірэнным чынам перабудаваць работу фінансава-каапэрацыйных арганізацый

Магілёў. Магілёўшчына уступіла ў 4-й квартал 3-га рашаючага году в вялікім прарывам у выкананьні фінпляну.

Зусім зразумела, што гэта патрабавала рашучай перабудовы работы фінансава-каапэрацыйных арганізацый, ФЗМК, сельсаветаў і партячэек на мясцох, ліквідаваць самацёк, разгарнуць шырокую масавую растлумачальную работу з насельніцтвам у напрамку мабілізацыі сродкаў. Лічбы выкананьня першых дзён 4 кварталу паказваюць што гэтага ня зроблена. Мабілізацыя сродкаў па раёне праходзіць яўна нездавальняюча, па ранейшаму гэта важнейшае пытаньне недаацэньваецца.

Рад раённых арганізацый, сельсаветаў, партячэек на мясцох недаацэньвае мабілізацыі сродкаў. Наогул трэба сказаць, што барацьба за фінплян ня ўзьнята на належную вышыню і ня ўсё зразумелі паказаньні партыі, што «без суровага выкананьня фінпляну немагчыма выкананьня пляну ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі».

Усё гэта прывяло да таго, что фінплян 4 кварталу на сёньняшні дзень выкананы ўсяго на 7,5 проц. Па сельгаспадатку і страхоўцы трэба было да 15 кастрычніка сабраць ня менш 80 проц., а сабрана ўсяго 63 проц.

«Пяршынства» ў бязьдзейнасьці мабілізацыі сродкаў як і раней належыць райспажыўсаюзу. Апошні выканаў плян па зборы паёў усяго на 10,3 проц. і па авансавых укладах—8,2 проц. Не адстае ад райспажыўсаюзу ЗРК і ЦРК. ЦРК па зборы паёў плян выканаў на 4,3 проц., а па авансавых укладах на 12,9 проц., ЗРК па паёх—на 13,6 проц.

Зусім няма ніякага зруху ў рэалізацыі акцый Трактарацэнтру. Ні МТС ні райкалгасасаюз, ні аддзяленьне дзяржбанку не прынялі рашучых захадаў да мабілізацыі мас на насьпяховую рэалізацыю акцый Трактарацэнтру. У выніку чаго плянавае заданьне выкананa ўсяго на 0,9 проц.

Ашчадкаса праяўляе злачынную бязьдзейнасьць у галіне прыцягненьня сродкаў на сацыялістычнае будаўніцтва. З прычыны чаго плян выкананы ўсяго на 12,9 проц.

Там, дзе была праведзена бальшавіцкая работа па мабілізацыі сродкаў, яна дазволіла разьбіваць апартуністычнае ныцьцё аб нерэальнасьці пляну і аб немагчымасьці іх выкананьня. На аснове шырокага разгортваньня масавай і растлумачальнай работы, на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва і няпрымірымай барацьбы з кулацтвам і яго агентурай рад сельсаветаў пасьпяхова спраўляецца з выкананьнем фінпляну. Так, Палыкаўскі сельсавет па падатку плян выканаў на 90,5 проц., Па страхоўцы 80,1 проц. таксама і па другіх плацяжох, Хрыпялёўскі—па падатку 88,5 проц. Махаўскі па падатку —85 проц. і Пашкаўскі па падатку—82 проц.

У тых сельсаветах, дзе не зматаліся і не зматаюцца за пасьпяховае разгортваньне сацбудаўніцтва, дзе не жадаюць працаваць па новаму, ня ўлічваюць важнасьці своячасовага фінансаваньня сацбудаўніцтва яны маюць ганебныя паказьнікі. Так Вендарацкі сельсавет плян выканаў па падатку на 30,8 проц., па страхоўцы—18 проц. і па самаабкладаньні—4,5 проц., Гусьліцянскі па падатку—46,4 проц., па страхоўцы—23 проц. і па самаабкладаньні—2,8 проц., Рафалаўскі па падатку—49,1 проц., па страхоўцы—36,5 проц., па самаабкладаньні—12 проц.

Такое становішча з выкананьнем фінпляну нецярпіма. Работа фінансавых каапэрацыйных арганізацый ФЗМК, сельсаветаў, партячэек на мясцох павінна быць перабудавана так, каб яна забясьпечвала своячасовае выкананьне фінпляну.

Нейанскі і Д. Алан.

Кельга старымі мэтадамі рыхтаваць новых спэцыялістаў

Будаўнічы інстытут яшчэ не перайшоў на актыўныя мэтады вучобы. Там да гэтага часу існуюць мэтады „лекцыі" і „курсавых залікаў"

За брыгадны мэтад вучобы

Справа падрыхтоўкі кадраў—важная справа. Разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва патрабуе ўсё новых і новых кадраў тэхнічна падрыхтаваных людзей. І нічога дрэннага ў тым, што іншага спэцыяліста адрываюць ад вытворчасьці і пераводзяць на работу па падрыхтоўцы кадраў.

Патрабуецца толькі каб гэты пераход быў прадуктаваны сапраўдным жаданьнем дапамагчы справе падрыхтоўкі кадраў і каб асоба, якая прымаецца за гэтую адказную справу, адчувала-б прызнаньне да гэтай работы і была-б прыгодна да яе.

Нічога падобнага нельга сказаць аб інж. Камінскім, зьмяніўшага работу будаўніцтва на работу па падрыхтоўцы кадраў высока кваліфікаваных будаўнікоў-інжынэраў. Ён пашоў з работы з Менскай будканторы у будінстытут загадваць вучэбнай часткай апошняга і вышэйшых курсаў пры ім, ставячых задачай пераквалфікацыю тэхнікаў і практыкаў у інжынэры.

Пачаць з таго, што інж. Камінскі ніколі ніякай школы ні ў якасьці выкладчыка, ні наогул школьнага работ ніка на ніюхаў. Прадстаўўся выпадак пакінуць вытворчасьць,—ён і пакінуў, тым больш, што новая служба абяцала і вялікі аклад, і лепшае снабжэньне. (Гэта было яшчэ да дэкрэта аб урачнаньні спэцыялістаў з індустрыяльнымі рабочымі).

Поўная адарванасьць і наведаньне той справы, за якую інж. Камінскі ўзяўся, сказалася ў яго падыходзе да арганізацыі работы на памянёных курсах.

Наша школа, як сярэдняя, так і вышэйшая, даўно ўжо перайшла ад гэтак званай лекцыйнай сыстэмы на актыўныя мэтады вучобы. Дзякуючы поўнай незнаёмасьці з новай савецкай школай інж. Камінскі доўгі час дапускаў уведзеньне заняткаў на курсах шляхам «чытаньня» курсу лектарамі, сам ужываючы гэты спосаб пры выкладаньні ім чытанага курсу. «Слухачы» (бо толькі і заставалася рабіць, што слухаць чытаньне»), цярпелі некаторы тэрмін, потым сабраўшыся пачалі вучыць свой вучэбны дапаможнік як цяпер працуюць у савецкай школе.

Лекцыйны спосаб пад напорам курсантаў быў з вялікімі цяжкасьцямі заменены мэтадам актыўнай прапрацоўкі матар'ялу.

Аб брыгадным мэтадзе прапрацоўкі матар'ялу інж. Камінскі таксама, відаць ня чуў. І тут слухачом прышлося яго цягнуць да ўвядзеньня гэтай сыстэмы прапрацоўкі матар'ялу. Адсталасьць інж. Камінскага ў справе кіраўніцтва вучэбным жыцьцём курсаў адчувалася на кожным кроку.

Курсанты пераканаліся, што маюць справу з «арапам» на вучэбнай справе.

Кансэрватызм інж. Камінскага адчуваецца і па гэты дзень. У той час, як усе выкладчыкі курсаў наладзіліся ўжо ў брыгадный сыстэме прапрацоўкі матар'ялу і праверкі вывучэньня курсантамі прахадзімага курсу, інж. Камінскі ўжывае старую, даўно адкінутую сыстэму праверкі, ведаў слухачоў (ён зьяўляецца і лектарам па гідраўліцы, водаправоду і каналізацыі) шляхам іх індывідуальнага апытваньня. Ад інж. Камінскага чуеш:

— Я павінен гадзіну кожнага з вас распытаць»!

І вышла так, што ўсе амаль добрасумленна працаваўшыя студэнты здалі залікі ўсім лектарам і ніводзін з іх ня здае яшчэ інж. Камінскаму. Усё гэта таму, што інж. Камінскі паўгода чытаў курс і не прапрацоўваў яго са студэнтамі. З-за гэтага ў яго няма амаль ніякага яўленьня аб пасьпяховасьці вывучэньня курсу асобнымі студэнтамі. Зараз-жа, пасьля сканчэньня «чытаньня» курсу, ён патрабуе здачы яго цалкам «адным махам». Студэнты і ня могуць і ня хочуць ісьці на такі прыём здачы курсу, які мяркуе толькі адно: у кароткі тэрмін вывучыць дапаможнік, здаць прачытанае і забыць курс.

Усё апісанае з дастатковай пераканаўчасьцю малюе інж. Камінскага як выкладчыка і заг. вучэбнай часткай вышэйшай школы.

Вывады, думаем зробяць адпаведныя арганізацыі.

Курсант.

Ударыць па лятунох

Лужасьнянскі сельска-гаспадарчы тэхнікум рыхтуе кадры для сельскай гаспадаркі і прамысловасьці. Трэба сказаць, што тут да гэтага часу не вядзецца барацьбы з прагуламі і лятунствам сярод студэнтаў. Дырэкцыя тэхнікуму і студэнцкія арганізацыі аб зьнішчэньні гэтых прагулаў, аб ліквідацыі тых прарываў, якія назіраюцца ў тэхнікуме не задумалі.

За апошні час назіраецца вялікі адлёў студэнтаў. Былыя студэнты Лужасьнянскага сельска - гаспадарчага тэхнікуму: Лук'янаў, Пястоў М, Казлова В., Жукава Л., Петрачэнка М. і др. яны-ж злосныя прагулышчыкі пераведзеныя ў другія навучальныя ўстановы.

Дырэкцыі Лужасьнянскага тэхнікуму і студэнцкім і камсамольскім арганізацыям неабходна падумаць аб гэтых зьявішчах.

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ
Стар. 2 № 246 (3335)

М. Б. Кроль

За бальшавіцкія тэмпы ў перабудове навуковай работы

(Да III усебеларускага зьезду навуковых работнікаў БССР)

Саюз ССР прыступае да складаньня пляну другой пяцігодкі. Для ўсіх ясна, што другая пяцігодка будзе ня толькі новым колькасна вялізарным скачком у разьвіцьцё тэхнічнай базы народнай гаспадаркі. Яна ўнясе поўную якасьць у перабудову нашай гаспадаркі, культуры і быту пралетарскіх і калгасных мас усіх народаў насяляючых наш Саюз. Скарыстаньне прыродных багацьцяў кожнай краіны, кожнай рэспублікі, каб дабіцца канчатковай улады чалавека над прыродай, максымальна мэтадычнае скарыстоўваньне чалавечай энэргетыкі, для пабудовы сацыялізму і прыстасаваньне ўсіх вынікаў навукі, каб дабіцца найлепшых умоў для праяўленьня ўсіх фізычных і псыхічных здольнасьцяй кожнага пралетара і кожнага калгасьніка для найхутчэйшага зьнішчэньня розніцы паміж фізычнай і разумовай працай—вось тыя вялізарныя грунтоўныя мэтаўстаноўкі, якія стаяць перад навукай у СССР у адказны час складаньня другой пяцігодкі гаспадаркі і культуры.

У прамове тав. Галадзеда, на прыёме делегацыі Беларускай Акадэміі Навук, надрукаванай у № 8—9 «Бальшавіка Беларусі» дана праграма заданьняў, якія стаяць перад навуковымі работнікамі БССР. Праблемы выкананьня, торфу, як базы энэргетыкі і аб'екту для хімічнай пераапрацоўкі, балотнай руды, будаўнічых матар'ялаў, тэхнічных культур, жывёлагадоўлі, праблема спэцыялізацыі раёнаў, барацьбы за марксыцка-ленінскую мэтадалёгію, праблема прыстасаваньня мэдыцыны, біолёгіі іншых навук да сацыялістычнага будаўніцтва, праблемы вывучэньня гісторыі, у прыватнасьці Беларусі, пытаньні «пераапрацоўкі чалавека» і г. д. і г. д.—яны даюць нязьлічоны матар'ял для навуковай працы. Канкрэтны эмпірычны навуковы матар'ял, ня можа быць адарваны ад мэтадалёгіі. Тэорыя тычныя работы павінны быць увязаны з паказанымі праблемамі рэвалюцыйнай практыкі. Але «практыка становіцца сьлепой, калі яна не асьвятляе сабе шляхі рэвалюцыйнай тэорыі».

III усебеларускі зьезд навуковых работнікаў, які адчуваецца 20-х г. г. павінен паставіць на ўвесь рост перад навуковымі работнікамі БССР усю проблематыку сацыялістычнай будоўлі ў канкрэтным разрэзе беларускай рэчаіснасьці. Ніводнага навуковага работніка без шчырага ўдзелу ў сацыялістычнай будоўлі, у складаньні пляну другой пяцігодкі.

***

Але адной праблематыкай не абмяжоўваюцца заданьні, якія зараз стаяць перад навуковымі работнікамі. Пытаньне тэмпаў дыктуе і новыя мэтады навуковай працы. Работа брыгадамі, з якіх кожная распрацоўвае падтэмы, сацспаборніцтва і ўдарніцтва, не на паперы, а на справе, грамадзкія бюкіры, давядзеньне плянаў да кожнага навуковага работніка, суспрэчныя пляны—усе гэтыя сацыялістычныя мэтады працы пакуль сярод навуковых працаўнікоў адчуваюцца вельмі мала. Самацёк і работа ў разваўку да гэтага часу пануюць у навуковых установах.

III Усебеларускі зьезд павінен жорстка паставіць перад усімі бюро сэкцый пры навуковых і навучальных установах пытаньне аб 100 проц. ахопе ўсіх навуковых работнікаў сацыялістычнымі мэтадамі працы.

***

Як і ў іншых савецкіх рэспубліках, так і ў БССР шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва завастрылі пытаньне аб навуковых кадрах. «Наша краіна ўступіла ў такую фазу разьвіцьця, калі рабочая кляса павінна стварыць сабе сваю ўласную вытворчую тэхнічную інтэлігенцыю» (Сталін). Тое-ж датычыцца і да навуковых кадраў. Рабоча-калгасная моладзь, якая зараз запаўняе ВНУ і ВТНУ, павінна стаць асноўнай крыніцай для падрыхтоўкі ўсіх спэцы

СПРАВАЗДАЧНУЮ КАМПАНІЮ САВЕТАЎ—НА ПОЎНЫ ХОД

Заваяваць месца ў „Чырвонай кнізе"—справа гонару кожнага гарсавету, сельсавету, сэкцыі і дэпутацкай групы

ЦО КП(б)Б „Зьвязда" аб „Чырвонай кнізе саветаў"

Сацспаборніцтва за месца ў „Чырвонай кнізе саветаў"

Паводле ініцыятывы газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ», праводзіцца сацспаборніцтва паміж саветамі за месца ў «Чырвонай кнізе» сацыялістычных дасягненьняў. Гэта спаборніцтва павінна дапамагчы перабудове работы сельсаветаў і разгарнуцца ва Ўсебеларускі агляд працы і посьпехаў гарадзкіх і сельскіх саветаў.

Міжраённая нарада жывёлагадоўчых раёнаў першай адгукнулася на ініцыятыву газэты «Савецкая Беларусь» і ўключыўся ў сацспаборніцтва, узяла на сябе рад канкрэтных абавязкаў па разгортваньні масавай работы саветаў, выкананьні прамфінпляну, арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, выкананьні плянаў загатовак і разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Міжраённая нарада саветаў Гомельскага, Рэчыцкага, Веткаўскага і Ўваравіцкага раёнаў таксама далучылася да закліку газэты «Савецкая Беларусь».

Усе гарадзкія і сельскія саветы, усе сэкцыі, дэпутацкія групы, грамадзкія арганізацыі павінны ўключыцца ў сацспаборніцтва на стварэньне «Чырвонай кнігі сацыялістычных рапартоў саветаў». («ЗЬВЯЗДА»).

Менскі Гарсавет не пасінен адставаць

Менскі гарсавет справаздачную кампанію па горадзе правёў больш менш здавальняюча. Але-ж у 18 прыгарадных сельскіх саветах па справаздачнай кампаніі нічога ня зроблена.

Гарсавет да гэтага часу ня склікаў ніводнай нарады старшынь сельсаветаў па пытаньні аб масавым аглядзе і справаздачнай кампаніі. У выніку чаго падрыхтоўчая работа да гэтай кампаніі не праводзіцца.

Трэба зараз-жа Менскаму гарсавету ўключыцца ў правядзеньне справаздачнай кампаніі ў прыгарадных сельсаветах.

З.

Забясьпечыць удзел работніц і сялянак у справаздачнай кампаніі саветаў

Усім раённым выканаўчым камітэтам і саветам

Аб удзе е саветаў у перавыбарах дэлегацкіх сходаў

Перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў і ўцягненьне новых пластоў работніц, калгасьніц і працоўных сялянак у работу дэлегацкіх сходаў павінна згуртаваць увагу ўсіх грамадзкіх арганізацый і саветаў вакол справы выхаваньня праз дэлегацкія сходы новых кадраў жаночага актыву, вакол справы пераўтварэньня дэлегацкіх сходаў у сапраўдныя ўдарныя брыгады па барацьбе за генэральную лінію партыі шляхам мабілізацыі шырокіх жаночых мас работніц, калгасьніц і ўсіх працоўных жанчын на выкананьне прамфінпляну, арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне калгасаў, вакол справы перабудовы масавай работы саветаў.

Прэзыдыум Цэнтральнага выканаўчага камітэту прапануе ўсім раённым выканаўчым камітэтам і саветам:

1. У часе падрыхтоўкі і правядзеньня перавыбарчай кампаніі дэлегацкіх сходаў арганізаваць самаправерку выкананьня дырэктыў па рабоце сярод жанчын, асабліва пастановы Прэзыдыуму Цэнтральнага выканаўчага камітэту БССР аб рабоце саветаў сярод дэлегатак, прыцягваючы да самаправеркі дэлегатак і ўвесь жаночы актыў, асьвятляючы вынікі праверкі на перавыбарчых сходах дэлегатак, на канферэнцыях працоўных жанчын і разгортваючы вакол гэтага пытаньня шырокую бальшавіцкую самакрытыку.

2. Намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па скарыстаньні на савецкай рабоце жанчын і вылучэньні сацнамесьнікаў з тых дэлегатак, якія былі прымацаваны да практычнай работы ў сэкцыях саветаў і выканаўчых камітэтах; таксама забясьпечыць ўцягненьне ў актыўную практычную работу зноў выбраных і прымацаваных да саветаў і сэкцыяй і дэпутацкіх груп—дэлегатам, забясьпечыўшы сыстэматычнае штодзённае кіраўніцтва іх работай.

3. Важнейшым зьвяном у справе ўзмацненьня масавай работы саветаў сярод жанчын павінна стаць ліквідацыя агульна - адукацыйнай, агранамічнай і палітычнай пісьменнасьці, а таму саветы павінны забясьпечыць арганізацыю спэцыяльных жаночых ліквпунктаў, вячэрніх курсаў і школ малапісьменных, палітгурткоў і лекцый па ліквідацыі аграмнісьменнасьці з тым, каб ахапіць гэтымі відамі масавай работы найбольш шырокія колы працоўных жанчын, і ў абавязковым парадку ліквідаваць пісьменнасьць сярод дэлегатак.

4. Справаздачная кампанія саветаў павінна ў поўнай меры адбіць усе дасягненьні і недахопы саветаў у справе ўцягненьня жанчын у прамысловасьць, вытворчую працу калгасаў, асабліва мерапрыемствы саветаў па выдучэньні жанчын на кіруючую работу у саветах і прыцягненьні выбарнага жаночага актыву да практычнай работы саветаў. Скарыстаць перавыбары дэлегацкіх сходаў у мэтах праверкі мерапрыемстваў саветаў, па разгортваньні ўсялякага роду бытавых устаноў і палепшаньні быту работніц і сялянак.

Раённыя выканаўчыя камітэты і саветы павінны забясьпечыць актыўны ўдзел работніц і сялянак у справаздачнай кампаніі саветаў, каб на падставе шырока разгорнутай крытыкі і самакрытыкі намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзьнаўленьні работы саветаў сярод жанчын, асабліва па ажыўленьні работы бытавых камітэтаў пры РВК і бытавых сэкцый пры саветах.

5. Усю масавую работу саветаў сярод працоўных жанчын падпарадкаваць асноўным задачам поўнага выкананьня ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній і ўцягненьня ўсіх працоўных жанчын у сацыялістычнае будаўніцтва.

У якасьці грамадзкага кантролю за выкананьнем усіх пералічаных задач ўвесьці пэрыядычныя агляды работы саветаў, пераклічку паміж імі, грамадзкі буксір на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

В. аб. Сакратара ЦВК БССР
Б. ВАНСОЎСКІ.

15 кастрычніка 1931 г.

Прыняць тэрміновыя захады

Выправіць памылкі на хаду

ЖЛОБІН. 19-X. (Наш кар.). Паводле плану райвыканкому, Майск. сельсавет павінен быў правесьці папярэдні агляд работы савету і пачаць справаздачную кампанію з 24-X—г. г.

Але на сёньняшні дзень прыходзіцца канстатаваць поўны провал гэтай важнейшай палітычна-масавай кампаніі ў сельсавеце.

Праўда, калі прыяжджаў у гэты сельсавет упаўнаважаны РВК, ён разам с саветам і мясцовым актывам склаў 4 брыгады для агляду работы саветаў і... на гэтым была пастаўлена кропка. Упаўнаважаны РВК склаў брыгады і паехаў, а савет пачаў чакаць пакуль гэтыя брыгады прыдуць яго «аглядаць». І з таго часу мінула больш дэкады. Старшыня савету тав. Гаспадарэнка ня ведае нават хто пайшоў у гэтыя брыгады, хто адказны за іх. Ніхто нічога ня ведае. Ледзь удалося знайсьці сьпіс брыгад у аднаго з настаўнікаў. У брыгады навербавана 20 чалавек, не правёўшы ніякай работы на гэтым пытаньні з калгасьнікам і бядняцка-серадняцкімі масамі. У выніку... брыгады складаюцца выключна з настаўніцтва і мясцовых служачых; ніводнага радавога калгасьніка, ніводнага аднаасобніка, бедняка і серадняка, бігнараваньне якога прасочваецца наогул ва ўсёй рабоце савету.

Толькі ў выніку гэтага бюракратычнага складаньня брыгад — савет мае і такія «посьпехі» у іх рабоце.

Калі-ж дадаць, што ніякай брыгады взята на складзена для агляду важнейшай галіны—жывёлагадоўлі, у той час, калі калгасы спэцыялізуюцца ў жывёлагадоўчым напрамку, зробіцца зусім зразумелым казённы падыход да ўсёй работы па правяджэньні агляду.

Пляну справаздачнай кампаніі няма. Мясцовыя арганізацыі (сельсуд, сельспажыўтаварыства, мэдпункт, школы, калгас) ня думаюць уключацца ў справаздачную кампанію разам з саветам.

Провал агляду ў Майскім савете зусім натуральны і таму, што няма партыкіраўніцтва гэтай кампаніяй, партячэйка гэтага пытаньня нават і не абгаворвала.

Райвыканком павінен ужыць тэрміновыя захады, дабіўшыся рашучага пералому ў рабоце Майскага сельсавету, на хаду выправіўшы дапушчаныя памылкі.

Закрэўскі.

Прэміі лепшым

Пытаньне аб правядзеньні масавага агляду работы і справаздачнай кампаніі саветаў у Касьцюковіцкім раёне абгаварана на прэзыдыуме РВК, на пленуме РК КП(б)Б і пашыраным пленуме РВК, на якім удзельнічалі ўсе старшыні сельсаветаў, загатчыкі школ і старшыні калгасаў.

Па лініі РВК даручаны сваячасова ўсім сельсаветам канкрэтныя паказаньні аб правядзеньні масавага агляду работы саветаў і справаздачнай кампаніі. Пры сельсаветах створаны з актыву па тры брыгады і агляд усёй рэботы саветаў.

Некаторыя сельсаветы ў раёне ўжо дасягнулі значных посьпехаў у гэтай рабоце. Масавы агляд работы саветаў поўнасьцю скарыстаны для ўзмацненьня ня тэмпаў па выкананьні загатовак, мабілізацыі сродкаў і іншых гаспадарча-палітычных кампаній. Сельсаветы: Беладуброўскі, Нізкаўскі, Хоцімскі і Селічоўскі, прэм'яваны пленумам РВК пры падагульненьні вынікаў аб выкананьні гаспадарча-палітычных кампаній.

Аднак нельга абыйсьці міма тых сельсаветаў, якія амаль зусім не зьвярнулі ўвагі на падрыхтоўку да справаздачнай кампаніі і нічога не зрабілі па масавым аглядзе работы саветаў. Да такіх сельсаветаў адносяцца: Забычанскі, Студзянецкі, Бялынкавіцкі і іншыя. Прэзыдыум РВК распусьціў прэзыдыум Бялынкавіцкага сельсавету за зрыў работы па ўсіх галінах сельсавету.

Каропаў.

Старасельскі сельсавет выклікае на лепшае правядзеньне справаздачнай кампаніі Віцебск сельсавет

ВІЦЕБСК (наш кар.). Падрыхтоўка да справаздачнай кампаніі і агляду работы саветаў на Старасельскім сельсавеце шырока разгорнута. Арганізаваны 7 брыгад, якія прыступілі да работы. Брыгадзіры прымацаваны да пасобных пунктаў, дзе разам з членамі сельсавету павінны арганізаваць калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкае селянства на выкананьне гаспадарча-палітычных кампаній.

У сувязі з тым, што ў выкананьні фінпляну ёсьць прарыў, брыгады мабілізуюць актыўнасьць калгасьнікаў, беднату і сераднякоў на тое, каб 4-ы квартал фінпляну выканаць да Кастрычніцкавых сьвят.

Старасельскі сельсавет выклікае на сацспаборніцтва па лепшаму правядзеньню агляду работы савету і справаздачнай кампаніі Віцебскі сельсавет.

Язэп Чорны.

Выканаць пляны зяблівага варыва,

завяршыць асеньнюю сяўбу

Асеньняя сяўба па радзе раёнаў БССР недазушчальна зацягваецца. На 15 кастрычніка агульны плян па зерну азімінь выкананы толькі на 91,7 проц. Апошняя пяцідзёнка амаль ніякага вруху ў справе пасьняховага канчэньня асеньняй сяўбы не дала. За 5 дзён з 10-га па 15-е кастрычніка процант выкананьня асеньняй сяўбы ўзрос толькі на 1,8

Толькі 16 раёнаў Беларусі скончылі асеньнюю сяўбу з перавыкананьнем сваіх пляноў. У гэты лік уваходзяць: Горацкі раён, выканаўшы на 111 проц., Крупскі—на 108,7 проц., Рагачэўскі—на 102 пр., Чэрвеньскі—на 103,1 проц. Гарадокскі—на 106,7 проц., Лепельскі на 102, проц., Бешанковіцкі—на 102,6 проц., Лёзьнянскі—на 101,8 проц., Расонскі—на 100,5 проц. Вушацкі—на 100,7 проц., Чашніцкі—на 101,5 проц., Бабруйскі—на 101,5 проц., Церахоўскі—101 проц., Чачэрскі—100,4 проц., Бялынкавіцкі — на 100 проц., Аршанскі 101,4 проц.

Рад раёнаў падходзіць да сканчэньня асеньняй сяўбы.

Але ёсьць і такія раёны, якія ганебна на плятуцца ў тыле асеньняй сяўбы. Так: Плешчаніцкі раён плян выканаў толькі на 74,2 проц., Суражскі—на 86,6 проц., Вузьдзенскі—на 82,5 проц., Крычаўскі—на 83,5 проц., Уваравіцкі—на 68,4 проц., Старадарожскі—на 77 проц., Рэчыцкі—на 76,7 проц., Петрыкаўскі—на 63,8 проц., Ельскі—на 70,8 проц., Буда-Кашалёўскі—на 62,1 проц.

Гэтыя факты ўскрава гавораць аб тым, што паказаныя раёны ўпна неда ацэньваюць дырэктывы партыі аб мабілізацыі ўсіх сіл і сродкаў на пасьняховае завяршэньне асеньняй сяўбы.

Яшчэ горшае становішча на фронце зяблевага варыва. Тут плян на 15 кастрычніка выкананы толькі на 21,9 проц. Апошняя пяцідзёнка дала прырост на зябу толькі 2,6 проц.

Большасьць раёнаў ганебна вырвае пляны зяблевага варыва. Так, Бешанковіцкі раён плян выканаў толькі на 4,4 проц., Віцебскі—на 7 проц., Чашніцкі—на 8,6 проц., Чавускі—на 3,8 проц., Плешчаніцкі—на 7,7 проц. Крычаўскі на 5,6 проц., Горацкі—на 9,5 проц., Бярэзінскі—на 0,6 проц., Рэчыцкі—на 5,6 проц., Лельчыцкі—на 8,1 проц., Лоеўскі—на 9,7 проц., Ельскі—на 5,9 проц., Куда-Кашалёўскі—на 5,2 проц., Веткаўскі—на 9,8 проц.

Дырэктыва партыі аб перакідцы 80 проц. трактароў і 80 проц. конскай цягавай сілы на мясцох нявыкананы.

Гэты буйнейшы прарыў у самы кароткі тэрмін павінны быць ліквідаваны.

У дэкадзінк калектывізацыі і ўзмацненьня выбыцьці пераміжнікамі на фронце асеньняй сяўбы зяблевага варыва.

А. З-Кі.

Вышэй узьнімць абароназдольнасьць краіны саветаў

Да абмеркаваньня ў нашай газэце № 244 „праграмы-мінімум для гарадзкіх і сельскіх саветаў, сэкцый і дэпутацкіх груп па ўключэньні ў «Чырвоную кнігу сацыялістычных рапартоў саветаў»—дадаецца даступны пункт ПА АБА РАНАЗДОЛЬНАСЬЦІ КРАІНЫ:

Адной з асноўных умоў забесьпячэньня мірнага будаўніцтва сацыялізму зьяўляецца павышэньне абараназдольнасьці краіны.

Саветы павінны гэтай справе аддаць максімальную ўвагу, узмацніўшы кіраўніцтва ўсёй работай па ўзмацненьні Чырвонай армії і ўкараненьні ваенных ведаў ў шырокія масы працоўных.

1. Стварыць і ладзіць работу ваўсковых куткоў і гурткоў пры клюбах, хатах-чытальнях, саўгасах і калгасах.

2. Узьняць на належную вышыню работу Асоавіяхімаўскіх каманд і атрадаў.

3. Аказваць усебаковую дапамогу сем'ям чырвонаармейцаў, прыняць рашучыя захады да палепшаньня культурна-бытавога абслугоўваньня камандна-палітычнага складу Чырвонай армії.

4. Рашуча ажывіць работу ваўсковых сэкцый.

Падрыхтоўка да справаздачнай у Дубровіцкім не разгорнута

Падрыхтоўка да справаздачнай кампаніі Дубровенскага гарсавету яшчэ не пачалася. Райграфсавет зусім нічога ня робіць па справаздачнай кампаніі гарсавету, ня гледзячы на тое, што бюро РК КП(б)Б даўно дало дырэктыву райграфсавету аб складаньні брыгад па праверцы работы гарсавету і яго сэкцый. Гарсавет некалькі разоў выклікаў старшыню райграфсавету на свае паседжаньні для інфармацыі аб падрыхтоўцы да справаздачнай кампаніі, але-ж старшыня райграфсавету т. Бязьлюдаў палічыў непатрэбным тэта зрабіць і не зьяўляўся на паседжаньні.

Фабком і парткалектыў фабрыкі «Дняпроўская мануфактура» амаль нічога ня робяць у правядзеньні агляду і падрыхтоўкі да справаздачнай кампаніі саветаў. У адказ на пастанову РК КП(б)Б фабком абмежаваўся толькі тым, што вылучыў брыгаду з 3-х асоб.

Клюбы, кіно, чырвоныя куткі і нас ценгазэты зусім не адлюстроўваюць у сваёй рабоце гэтай важнай кампаніі.

Бюро райкому трэба заняцца гэтым пытаньнем і абудзіць нізавых парт. і прафработнікаў і гарпрафсавет Дубровны ад апарэтурнічнай сьпячкі.

Чэрвінскі П.

Да пленуму ЦК КП(б)Б

БЯРЭЦЕ ПРЫКЛАД

З камсамольскіх ударных брыгад паравозаў Щ—432 і Э—44 Віцебскага вузла, якія на практыцы ажыцьцяўляюць загад наркому шляхоў зносін тав. Андрэева

Кіраўніцтва Днепра-Дзьвінскага пароходства з работай не спраўляецца

(Ад нашага спэцкора).

Віцебскае раённае Днепра-Дзьвінскае рачное пароходства мае вялікія прарывы ў выкананьні трамфінпляну. Дысцыпліна сярод рабочых і служачых прыстані Віцебск адсутнічае, пароходы і баржы прастойваюць па 2—3 дні пры кожнай прыстані. Культмаса вай работы няма, у выніку чаго сярод рабочых бываюць выпадкі антысэмітызму. Звычайная лаянка рабочага на выгрузцы: «хахол», «жыд». Адміністрацыя прыстані не вядзе з гэтым ніякай барацьбы.

Па віне загатовчых арганізацый: Сураскага і Бешанковіцкага сельспажыўтаварыстваў, райснабу і райспажыўкапэрацыі, з-за правага апарту нізму з боку Днепра-Дзьвінскага раённага кіраўніцтва і прыстані Віцебск —гадавы плян перавозак выкананы за апошнюю пяцідзёнку на 51 проц., пра стой рачнога транспарту дасягнуў 35 проц. Прагулы і прастої рабочых яшчэ больш павялічваюцца.

Сыстэматычнае зрываньне графіку і адсутнасьць кантролю прывяло да таго, што спаранная ядза ня ўведзена, абязьлічка не ліквідавана, натлядаецца паломка барж. Капітаны пароходаў і матросы адносяцца да сваіх абавязкаў дрэнна, у выніку чаго пагружаныя баржы затаўляюцца. Ёсьць пмат затопленых грузаў. Прывезеную буль бу насыпаюць вельмі вострымі лапатамі, з прычыны чаго больш 20 проц. бульбы псуецца. Прывезеныя машыны (сіты) для лёнаазводаў ляжаць нявезенымі і замочаны ў вадзе.

Падрыхтоўка воднікаў да навігацыі не праводзіцца. Плян асеньня-зімовых перавозак не абгаворваецца сярод мас. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не праводзіцца. Начальнік прыстані Віцебск—Баскін з сваёй работай не спраўляецца, ён за работай ня сочыць.

Транспартная кампэрацыя забясьпечвае рабочых добра, толькі патрэбна, каб было добрае кіраўніцтва для мабілізацыі мас на асеньня-зімовыя перавозкі, чаго пакуль што няма.

Трэба адзначыць што справа перавозак праходзіць самацёкам, гружаная баржа са збожжам, бульбаю можне пад дажджом, няма падрыхтаванай тары і брэзэнту, у выніку чаго, гэтае збожжа гіне. Яшчэ горш справа абстаіць з падачай транспарту на прыстанях Вулы, Бешанковічы, Віцебскага раёну.

Днепра-Дзьвінскае рачное кіраўніцтва 6 эксплёатацыйнага раёну ня прымае ніякіх мер для разгрузкі грузаў, якія ляжаць на ракі па 18—20 дзён.

Усё гэта гаворыць за тое, што Віцебскія воднікі да пленуму ЦК КП(б)Б і Кастрычнікавай рэвалюцыі падыходзяць з вялікімі прарывамі.

М.

Сустрэчны выканаем

Прамфінплян па Жлобінскім чыгуначным аддзяленьні сувязі выконваецца добра. Заданьне было на 30.500 руб., але гэтая лічба чыгуначнае аддзяленьне не задаволіла, і яно па ўдарнаму высунула сустрэчны плян на 52200 руб. Дзякуючы ўмеламу кіраўніцтву працаю адміністрацыі чыгуначнага аддзяленьня сувязі прамфінплян на 1 кастрычніка выкананы па сустрэчным пляне на 37.390 руб. або 72 проц.

Чыгуначнае аддзяленьне сувязі ўпэўнена, што да канца году выканае і перавыкананае сустрэчны прамфінплян, дзякуючы разгорнутаму сацспаборніцтву і ўдарніцтву і сталаму вучоту і кантролю за жякасьцю работы.

Па чыгуначным аддзяленьні сувязі ліквідавана абязьлічка, палепшана сартоўка карэспандэнцыі, ліквідавана цякучасьць штату, чым забясьпечана поўнае выкананьне прамфінпляну.

Посьпехі чыгуначнага аддзяленьня сувязі трэба замацаваць, шырэй разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Мы патрабуем ад Белкіраўніцтва сувязі прэм'яваць барацьбітоў за выкананьне прамфінпляну па Жлобінскім чыгуначным аддзяленьні сувязі.

К. Гарошка.

НЕ ЗДАВАЦЬ ТЭМПАУ

ЗЖЫЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНАЕ НЕДАВЫКАНАНЬНЕ ШТОДЗЁННЫХ ПЛЯНАЎ АДГРУЗКІ

Наша запазычанасьць Ленінграду ўзрастае

ЛІЧБА АДГРУЗКІ Ў 7719 ТОН ПАВІННА БЫЦЬ ПЕРАВЫКАНАНА

Узмацніць тэмпы адгрузкі садавіны і гародніны пралетарскім цэнтрам

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Пра выкананьне дырэктыў аб забесьпячэньні пралетарскіх цэнтраў садавінаю і гароднінаю

Выслухаўшы даклады дырэктара Белсадгароднінны т. Хавіча, дырэктара Белкаапсадгароднінны т. Зелічонка і старшыні Белсадгарадсаюзу т. Панамарова і садаклад прадстаўніка НК-РСІ БССР т. Аллярштэйна, Камісія Выкананьня пры СНК БССР устанаўляе, што дырэктывы партыі і ўраду аб бесьперабойным забясьпечаньні пралетарскіх цэнтраў садавінаю і гароднінаю ня выконваюцца, у выніку чаго плян адгрузкі бульбы ў Ленінград на 10-X—выканан толькі на 18,3 проц., а плян забесьпячэньня бульбаю выкананы па г. Менску на 20 проц., па Віцебску на 22,8 проц. па Гомлі на 10,1 проц.

Пры гэтым Камісія Выкананьня асабліва адзначае наступнае:

а) зусім нездавальняюча ідзе загатоўка садавіны і гароднины, што тлумачыцца слабым разгортваньнем уборкі садавіны і гароднины і адсутнасьцю канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва з боку загатоўчых арганізацый;

б) Белсадгароднінна не забясьпечыла выкананьня пляну адгрузкі садавіны і гароднины і ня ўжыла рашучых захадаў да забясьпечаньня бягучай садавінагародняй кампаніі тэхнічнаю базаю і не праявіла ніякай ініцыятывы ў справе замены дэфіцытных будаўнічых матэрыялаў нядэфіцытнымі;

в) спажываючыя арганізацыі (ЦРК, ЗРК, ЗВК і ТСТ), арыентуючыся ў асноўным на цэнтралізаванае забясьпечаньне садавінаю і гароднінаю, зусім недастаткова разгарнулі дэцэнтралізаваныя загатовкі;

г) Белкаапсадгароднінна ў некаторых выпадках плянавала завоз гародніны ў пралетарскія цэнтры БССР бяз уліку наяўнай таварнай прадукцыі ў даным раёне, у выніку чаго нарады выдаваліся на раёны, дзе занарадженай прадукцыі ня было;

д) Народны Камісарыят Снабжэньня і Белкаапсадгароднінна, ня ўлічыўшы вопыту мінулага году, часта зьмянялі раёны загатовак, што прыводзіла да блытаніны ў справе прымацаваньня пасобных спажываючых арганізацый да загатоўчых раёнаў і адмоўна адбівалася на ходзе загатовак і забясьпячэньні пралетарскіх цэнтраў садавінаю і гароднінаю;

е) Белкаапсадгароднінна не ўстанавіла цьвёрдых каляндарных тэрмінаў адгрузкі гароднины, у выніку чаго садавіна і гароднінна паступала ў пралетарскія цэнтры БССР самацёкам і бесплянава;

ж) Белкаапсадгароднінна і мясцовыя спажываючыя арганізацыі ня ўжылі рашучых захадаў да забясьпечаньня кампаніі па пераапрацоўцы гародніны, з прычыны чаго плян засолкі гуркоў выканан толькі на 63 проц.;

з) Белкаапсадгароднінна пры колькасным выкананьні пляну пашырэньня гандлёвай сеткі не забясьпечыла наближэньня крам па рэалізацыі садавіны і гародніны да рабочых акраін.

Выходзячы з гэтага, Камісія Выкананьня пры СНК БССР—**пастанаўляе:**

1. Абавязаць Белкаапсаюз, пад адказнасьць т.т. Хаскіна і Зелічонка, Белсадгароднінну, пад адказнасьць т. Хавіча, і Белсадгарадсаюз, пад адказнасьць т. Панамарова, для ўзмацненьня адгрузкі бульбы ў Ленінград і заканчэньня яе ў вызначаны тэрмін (1 лістапада) намірацаць адказных працаўнікоў у большасьці і татарыя раёны, ўзяўшы пры гэтым цэлую работу раённых загатоўчых арганізацый пад свой неаслабны нагляд і рашуча рэагуючы на ўсе моманты расхлябанасьці ў справе адгрузкі гароднины ў Ленінград.

Адначасова прапанаваць Белсадгароднінне і Белсадгарадсаюзу наладзіць падлік паступленьня гароднины па пасобных сэктарах.

2. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты пад адказнасьць іх старшынь:

а) на працягу пяці дзён праверыць выкананьне кулацка-заможнымі гаспадаркамі дадзеных ім цьвёрдых заданьняў, ужыўшы рашучыя меры ўзьдзейнічаньня да тых гаспадарак, якія ўхіляюцца ад своячасовага выкананьня гэтых заданьняў;

б) праверыць рэальнасьць кантрактыйных дагавораў і ці ўручаны ўсім кантрактантам кантрактыйныя кніжкі;

в) узяць пад асобны нагляд ход адгрузкі бульбы ў Ленінград, выслухоўваючы праз кожныя 5 дзён інфармацыю раённага інспэктара снабжэньня і загатоўчых арганізацый аб ходзе адгрузкі гароднины ў Ленінград.

3. Абавязаць Белсадгароднінну, пад адказнасьць т. Хавіча, забясьпечыць рэалізацыю пляну адгрузкі садавіны і гароднины ва ўстанаўленыя тэрміны і выканаць плян будаўніцтва праз мабілізацыю мясцовых рэсурсаў будаўнічых матэрыялаў.

4. Абавязаць Белкаапсадгароднінну, пад адказнасьць т. Зелічонка:

а) пабудаваць сыстэму выдачы нарадаў на завоз садавіны і гароднины ў пралетарскія цэнтры БССР на строгім падліку таварнай прадукцыі ў даным загатоўчым раёне, забясьпечыўшы пры гэтым плянавае ня паступленьне праз устанаўленьне цьвёрдых каляндарных тэрмінаў па адгрузцы гароднины і сыстэматычны кантроль за захаваньнем гэтых тэрмінаў;

б) паслаць у Гомель і Віцебск сваіх адказных упаўнаважаных на ўвесь час садавіны-гародняй кампаніі для практычнай дапамогі ў справе яе правядзеньня;

в) забясьпечыць выкананьне пляну пераапрацоўкі гароднины праз своячасовае заканчэньне будаўніцтва квасільных пунктаў і разгортваньне ініцыятывы сталовак і ЖАКТ'аў у справе пераапрацоўкі;

г) наблізіць гандлёвую сетку па рэалізацыі садавіны і гароднины да рабочых акраін, забясьпечыўшы пры гэтым рабочаму насельніцтву магчымасьць атрыманьня садовіны і гароднины з усіх крам даная гораду незалежна ад таго, у якіх арганізацыях (ЦРК, ЗРК і г. д.) знаходзіцца тая ці іншая гандлёвая адзінка;

д) пачаць падрыхтоўчую работу па будаўніцтву у 1932 г. захавальняў і пераапрацоўчых пунктаў у раёнах вытворчасьці гароднины.

5. Даручыць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня ў дэкадны тэрмін распрацаваць і падаць на разгляд Эканамічнага Савету прапановы аб канцэнтраваньні ў адной арганізацыі найбольш вялікіх захавален, складаў і пераапрацоўчых пунктаў для стварэньня адзінай гародняй гаспадаркі і падвядзеньня пад яе матутнай тэхнічнай базы.

6. Забараніць на будучы час усякія ломкі пляну прымацаваньня спажываючых цэнтраў да загатоўчых раёнаў без асобнага дазволу ў кожным выпадку СНК.

7. Бяручы пад увагу паасобныя выпадкі скрыўленьня дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб разгортваньні самастойнага гандлю гароднінаю па лініі саўгасаў і калгасаў, папярэдзіць Белсадгарадсаюз, дырэктароў саўгасаў і старшынь калгасаў, што разгортваньне саўгасамі і калгасамі ініцыятывы ў справе гандлю гароднінаю ні ў якім разе ня можа і не павінна адбіцца на выкананьні цэнтралізаванага пляну загатовак і здачы імі гародніны.

8. Абавязаць усе ЦРК, ЗРК, ЗВК і ТСТ пад адказнасьць старшынь кіраўніцтваў:

а) разгарнуць у максымальнай меры самастойныя загатоўкі садавіны і гароднины, для чаго камандыраваць сваіх адказных работнікаў у раёны для ўстанаўленьня сувязі з адпаведнымі саўгасамі і калгасамі, а таксама для ўзмацненьня адгрузак садавіны і гароднины па заключаных ужо дагаворах;

б) забясьпечыць патрэбную колькасьць памяшканьняў для захаваньня гароднины;

в) забясьпечыць свае крамы кваліфікаваным інструктажам па рэалізацыі садавіны і гароднины.

9. Адзначаючы факты злоўжываньня паасобных загадчыкаў крам садавіны і гароднины (штучнае павялічэньне цэн, выдача нізкіх гатункаў садавіны і гароднины па цэнах вышэйшых гатункаў і г. д.), даручыць Народнаму Камісарыяту Снабжэньня, гарадзкім і раённым інспэктарам снабжэньня ў станавіць сталы нагляд за захаваньнем цьвёрдых прадажных цэн на садавіну і гароднину, прыцягваючы да суровай адказнасьці тых работнікаў крам, якія штучна павялічваюць гэтыя цэны, адначасова ўстанаўліваючы кантроль і за захаваньнем загатоўчымі арганізацыямі ўстаноўленых норм накідак.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР А. Кадзін.

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. Элькін.

20 кастрычніка 1931 г.
Менск.

Плян адгрузкі бульбы за межы БССР выкананы толькі на 51,7 проц. Усе загатоўчыя арганізацыі, замест таго, каб замацаваць тэмпы дасягнутыя на 20-X—21-X здалі іх, а Белпло дагароднінна, якая адгрузіла 20-X — 2074 тоны, учора адгрузіла толькі 1196 тон.

Асабліва дрэнна адгружае бульбу Нараўлянскі райкаапсаюз, які замест 300 тон адгрузіў 76 тон.

ВАЗЬМЕЦЕ ПРЫКЛАД З ПЕРАДАВІКОЎ

Белкаапплодагароднінна зьвярнулася з адозвай да партыйных і прафэсыянальных арганізацый Быхаўскага, Клічаўскага, Крупскага, Лепельскага, Мсьціслаўскага, Слуцкага, Старобінскага, Уваравіцкага, Вушацкага, Чавускага, Чашніцкага, Чырвона-Слободзкага і Рагачэўскага райспажыўсаюзаў аб узмацненьні работы па адгрузцы бульбы Ленінграду.

— Партыяй і ўрадам,—гаворыцца ў адозьве,—на нашу сыстэму ўскладзена важнейшая баявая задача—адгрузка бульбы пралетарыям Ленінграду. Гэтая баявая задача павінна быць выпаўнана да 1 лістапада. Загад партыі і ўраду павінен быць выканан нашай сыстэмай у вызначаны тэрмін.

Мы выклікалі на сацспаборніцтва па 100-процантным выкананьні вывазу да 1 лістапада Заходнюю вобласьць. Сёньня намі атрыманы зьвестка, што Заходняя вобласьць выканала свой плян на 73 проц., мы-ж выканалі толькі на 53 проц.

У той час калі Аршанскі, Бабруйскі, Бягомльскі, Дрысенскі, Клімавіцкі, Крычаўскі, Магілеўскі, Нараўлянскі, Рэчыцкі, Талочынскі і Чэрыкаўскі райсаюзы па бальшавіцку выканалі свае пляны вывазу, а райсаюзы—Асіпавіцкі, Глускі Жлобінскі, Мазырскі, Касьцюковіцкі, Капыльскі, Любаньскі, Полацкі, Расонскі і Шкловскі—блізкі да выкананьня пляну вывазу, вы сваім адставаньнем ставраеце рэальную пагрозу зрыву гэтага важнейшага заданьня і зрываеце спаборніцтва з Заходняй вобласьцю.

З колькасьці бульбы, якая падлягае адгрузцы—39.000 тон, вашы арганізацыі яшчэ павінны адгрузіць 27.000 тон. Такім чынам выключна ад вашай працы залежыць своячасовае выкананьне гэтага важнейшага заданьня партыі і ўраду.

Мы зварочваемся да вас, каб вы на падставе шырокага сацспаборніцтва паміж асобнымі раёнамі, сельспажыўтаварыствамі, калгасамі і сельсаветамі, прыцягваючы шырокія масы калгасьнікаў, актыву, мабілізаваўшы для непасрэднай працы на вёсцы ўвесь свой апарат, дабіліся-б сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў, якія-б забясьпечылі поўнае выкананьне ў вызначаны тэрмін загаду партыі і ўраду.

Мы чакаем ад вас безадкладнага рашучага пералому, сапраўдных баявых дзеньняў і зьвестак.

Мельнікаў.

Няма работы з рабселькорамі

У Парыцкім раёне пра пастанову 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў забыліся. Да гэтага часу раён ня мае сваёй раённай газэты. Яшчэ ў чэрвені была ўтворана рэдкалегія і выпушчаны першы нумар газэты, які пасьля таго ня выходзіў. З рабселькорамі работа не вядзецца. РК КП(б)Б ня ведае колькі ў раёне рабкораў і дзе яны знаходзяцца. Такое становішча надалей недапусьцім».

Кручкоў.

Абвешчан штурм па ліквідацыі прарываў

(Ад нашага спэцкора)

На Віцебскім чыгуначным вузьле разгорнута падрыхтоўка да Кастрычніцкіх сьвят. Абвешчаны штурм па ліквідацыі прарываў у выкананьні трамфінпляну. На цэхавым адкрытым партсходзе паравозных брыгад ст. Віцебск, пры абгаварэньні загаду НК шляхоў зносін тав. Андрэева пры разгорнутай самакрытыцы было выкрыта шмат недахопаў і прарываў у рабоце пасобных брыгад. Працоўная дысцы

У тэрмін і поўнасьцю забясьпечыць мясам пралетарскія цэнтры

Петрыкаўскі і Касьцюковіцкі раёны па-бальшавіцку выконваюць пляны мясазагатовак

Дабіцца поўнага выкананьня пляну мясазагатовак

Выкананьне пляну мясазагатовак мае асаблівае палітычна-гаспадарчае значэньне. У кастрычніку трэба выканаць 35 проц. пляну IV кварталу. Між тым, тэты плян па БССР на 16 кастрычніка выкананы усяго на 7,7 проц.

Па сыстэмах выкананьне пляну адлюстроўваецца ў наступных лічбах: Белкаапсаюз—6,5 проц., Белхлебжыўсаюз — 8,3 проц.

Асобныя раёны падыходзяць ужо да выкананьня заданьня. Так, **Петрыкаўскі раён квартальны плян выканаў на 25,7 пр., Касьцюковіцкі — на 23,2 проц., Камарынскі — на 18,4 проц., Парыцкі — на 18,7 проц. і Талачынскі — на 19,9 проц.**

Але іншыя раёны ганебна цягнуцца ў хвасьце. **Асіпавіцкі раён, напрыклад, квартальны плян выканаў усяго на 2,5 проц., Барысаўскі — на 3,4 проц., Краснапольскі — на 2,5 проц., Клічаўскі — на 3 проц., Любанскі — на 3,8 проц., Мазырскі — на 2,8 проц., Рагачэўскі — на 3,6 проц., Уваравіцкі — на 2,1 проц., Бабруйскі — на 3,4 пр., Бялыніцкі — на 2,4 проц., Гарадокскі —на 1,2 проц., Полацкі на 2,8 проц., і Сенненскі — на 3,1 проц.**

Гэтыя лічбы гавораць за тое, што мясазагатоўкі ў гэтых раёнах амаль пачэ не пачыналіся.

Раённыя кіруючыя загатоўныя арганізацыі яшчэ да гэтага часу не разгарнулі работы па баявому, не ўзялі тых тэмпаў, якія-б запраўды забясьпечвалі выкананьне пляну мясазагатовак.

Раённыя арганізацыі гэтых раёнаў ня прымусілі кулака выканаць цьвёрдыя заданьні і не прынялі рашучых мер да злосных нездатчыкаў цьвёрдых заданьняў.

У большасьці раёнаў пляны мясазагатовак яшчэ не даведзены да сяла, калгасу і ня ўсім кулацка-заможным гаспадаркам дадзены цьвёрдыя заданьні.

Брыгадзіры цэнтральных загатоўчых арганізацый, пасланыя ў раёны не дабіліся пералому ў рабоце, якія бяздзейнічаюць і займаюцца нікому не патрэбнай перапіскай. Так, брыгадзір з Мазыра тав. **Капылаў** піша ў Белмяса: «прымеце тэрміновыя захады да раёнаў Мазыр, Ельск, Нароўля, якія яшчэ не разьмеркавалі плянаў». Цікава што-ж зрабіў сам тав. Капылаў для таго, каб падштурхнуць гэту работу на месцы!

Белмяса ў сваю чаргу адсылае ўсю перапіску Наркамснабу, для прыняцьця мер і на гэтым ставіць кропку. Гэты факт сьведчыць аб тым, што заместчоткай дзелавой работы ў апэрацыйным кіраўніцтве Белмяса займаюцца самастрахоўкай.

***

30 чэрвеня Наркамснаб вынес пастанову аб прэм'яваньні лепшых раёнаў за перавыкананьне пляну мясазагатовак і вылучыў фонд 15.000 руб., прапанаваўшы Белкаапсаюзу ў 3-х дзёны тэрмін адгрузіць прэм'яваным раёнам прамтавары. Пасьля гэтага прайшло ўжо 4 месяцы, але тавары раёнам да гэтага часу не адгружаны поўнасьцю. Напрыклад, гатовая вопратка, фонды якой мелася, так і не была адгружана.

Аб'яднаньне БАКТ запэўніла брыгаду, што радыё-устаноўкі і барометры адгружаны ўсім раёнам, але Глускі раён прыслаў паведамленьне, што да гэтага часу гэтыя тавары ім не атрыманы. Пры праверцы аказалася, што радыё і барометры Глуску сапраўды не адасланы.

Вось як Белкаапсаюз стымулюе мяса загатоўкі.

***

З адгрузкай мяса Ленінграду справа абстаіць ня лепш. Кастрычніцкі плян адгрузкі выкананы ўсяго на 18 проц., у той час, калі маецца яскравая дырэктыва ЦК КП(б)Б аб фарсаванай адгрузкі мяса Ленінграду і да поўнага выкананьня гэтай дырэктывы ёсьць усе магчымасьці.

Усё гэта сьведчыць аб тым, што раённыя арганізацыі яшчэ дагэтуль не разгарнулі шырокай растлумачальнай работы аб палітычна-гаспадарчай важнасьці мясазагатовак, не паставілі мясазагатоўкі, як адну з галоўных задач у загатоўчай кампаніі. У выніку гэтага зрываюцца пляны сваячасовага забясьпечаньня пралетарскіх цэнтраў мясам.

Патрэбен рашучы пералом. Загатоўчыя арганізацыі павінны мабілізаваць максімум увагі свайго апарату на выкананьне пляну мясазагатовак і адгрузкі мяса пралетарскім цэнтрам.

Трэба зараз-жа мабілізаваць грамадзкасьць, у самы бліжэйшы час спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулака.

Пракуратуры Рэспублікі патрэбна ў тэрміновым парадку разгледзець справу невыкананьня і ігнараваньня дырэктыў партыі і ўраду Белкаапсаюзам, які злачынна адносіцца да справы мясазагатовак.

Плян павінен быць выкананы цалкам і ў тэрмін.

Брыгада «Савецкай Беларусі»
Касьцяневіч, Плумэ.

Поўнасьцю выканаць плян камплектаваньня статку

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Пра выкананьне дырэктыў ЦК КП(б)Б і СНК БССР пра арганізацыю, укамплектаваньне і разьвіцьцё малочных і сьвінагадоўчых таварных фэрм

Выслухаўшы даклады ўпаўнаважанага Малакакалгасцэнтру т. **Грыневіча**, Нам. Упаўнаважанага Сьвінаводкалгасцэнтру т. **Номаля**, Сельгасаб'яднаньня Белкаапсаюзу т. **Вайцеховіча** і садаклад прадстаўніка НК РСІ т. **Бабака**, Камісія Выкананьня ўстанаўляе, што ва ўкамплектаваньні статку таварных калгасных фэрм ёсьць значныя дасягненьні: у малочна-таварных фэрмах пастаўлена 110.404 штук буйнай рагатай жывёлы, з іх 65.274 кароў, а ў сьвінагадоўчых таварных фэрмах пастаўлена 63.965 сьвіноматак, але разам з гэтым ёсьць і вялікія недахопы ў будаўніцтве, стварэньні кармавой базы, утрыманьні, правільным кармленьні і догляде жывёлы.

Пералічаныя арганізацыі ня выканалі пастаноў ЦК КП(б)Б і СНК БССР па змаганьні з эпізоотыямі і па арганізацыі працы ў калгасных таварных фэрмах.

Для зьніжэньня адзначаных недахопаў, Камісія Выкананьня пры СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, пад адказнасьць тав. **Масюкова**, Беларускія Аддзяленьні Сьвінаводкалгасцэнтру і Малакокалгасцэнтру, пад адказнасьць т.т. **Красоўскага і Грыневіча**, Сельскагаспадарчае Аб'яднаньне Белкаапсаюзу, пад адказнасьць тав. **Вайцеховіча**, загадчыкаў раённых зямельных аддзелаў, загадчыкаў малочных і сьвінагадоўчых калгасных таварных фэрм і раённыя калгасаюзы, пад адказнасьць іх старшынь:

а) правесьці канкрэтныя мерапрыемствы для арганізацыйнага замацаваньня малочных і сьвінагадоўчых таварных фэрм, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на пабудаваньне фэрм і павялічэньне іх таварнасьці;

б) поўнасьцю ў IV-м квартале выканаць плян камплектаваньня статку фэрм;

в) на працягу дэкады закончыць складаньне кармавых балянсаў таварных фэрм забясьпечыўшы сваячасовае і поўнае выкананьне пляну нарыхтовак адпаведных культур і да 5 лістапада 1931 г. стварыць кармавыя фонды, якія-б у поўнай меры забясьпечылі кармамі жывёлу на таварных фэрмах;

г) закончыць пачатае будаўніцтва на фэрмах не пазьней 15 лістапада 1931 г. перавёўшы ўсю работу па будаўніцтву на прэміяльна зьдзельную аплату;

д) выканаць дырэктывы ўраду БССР па нармальным утрыманьні, кармленьні і доглядзе за жывёлаю, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на правядзеньне прафілактычных мерапрыемстваў у таварных калгасных фэрмах і поўнае выкананьне ветэрынарна-зоотэхнічных запатрабаваньняў. Кантроль за гэтым ускласьці на загадчыкаў раённых зямельных аддзелаў, усіх ветэрынарных работнікаў і раённых агранамаў.

Прапанаваць усім раённым выканаўчым камітэтам прыцягваць да суровай адміністрацыйнай і судовай адказнасьці.

2. Прызнаючы зусім недапушчальным, што няма сталага падліку на фэрмах, абавязаць Народны Камісарыят Земляробства, пад адказнасьць т. Сакалова і Бел. Аддзяленьні Сьвінаводкалгасцэнтру і Малакокалгасцэнтру, пад адказнасьць т. т. Красоўскага і Грыневіча у дэкады тэрмін завесьці сталы падлік на таварных калгасных фэрмах наяўнасьці пагалоўя, яго руху, здачы таварнай прадукцыі і г. д., дабіўшыся сталага і рэгулярнага апэрацыйнага падліку.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства і Белкалгасцэнтру ў дэкады тэрмін распрацаваць формы аматы працы на таварных калгасных фэрмах, якія-б эканамічна зацікавілі абслугоўваючы персанал у выкананьні ўсіх праец па догляду за жывёлаю, кармленьні яе, па выхаду таварнай прадукцыі і выкананьні ветэрынарна-зоотэхнічных запатрабаваньняў і не пазьней 5 лістапада 1931 г. падаць на зацьверджаньне СНК практычныя прапановы па гэтым пытаньні.

4. У лістападзе выслухаць на Камісіі Выкананьня даклады раду раённых выканаўчых камітэтаў, раённых калгасаюзаў і загадчыкаў калгасных таварных фэрм, а таксама праверыць выкананьне дырэктыў Ураду па калгасных таварных фэрмах па пасасовых пытаньнях: камплектаваньне, арганізацыя працы, упрыманьне і догляд за жывёлаю, здача таварнай прадукцыі, арганізацыя цялячых калгасных фэрм і гэтак далей.

У сувязі з гэтым даручыць НК РСІ весьці і далей работу па праверцы дырэктыў аб арганізацыі і разьвіцьці малочных, сьвінагадоўчых і цялячых калгасных фэрм.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
А. Калнін.

Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР
Я. Элькін.

20 кастрычніка 1931 г.
г. Менск.

Папярэдзіць зрыў мясазагатовак

Мясазагатоўкі і адгрузка мяса ў Магілеўскім раёне праходзіць вельмі марудна. Дзякуючы нядбайнасьці райспажыўсаюзу і райкалгассаюзу толькі 15—X райснабам былі опушчаны ў сельсаветы пляны мясазагатовак. Ні райспажыўсаюз, ні райкалгассаюз не далі ніякіх паказальняў загатоўчым арганізацыям, у правядзеньні мясазагатовак, у выніку чаго рад сельсаветаў маюць ня ведаюць куды здаваць жывёлу.

Масавая растлумачальная работа сярод калгасных і бяднацка-серадняцкіх мас не разгорнута. Амхаўскі, Вендарскі, Грэдзянеўскі, Дашкаўскі і Цішоўскі сельсаветы да гэтага часу не далі кулацка-заможным гаспадаркам цьвёрдых заданьняў па мясазагатоўках.

Як выніК гэтага плян мясазагатовак і адгрузкі выкананы каля 40 проц. (на 15-X). Па радзе сельсаветаў гэтая работа яшчэ не пачата.

Такія безадказныя адносіны да мясазагатовак і адгрузкі бульбы ў Магілеўскім раёне павінны атрымаць рашучы адпор.

Трэба неадкладна мабілізаваць масы на барацьбу за поўнае выкананьне пляну, у тэрмін спагнаць цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак.

Брыгада «Сав. Беларусь»
Ал. Нёманскі, Д. Алан.

Мяса разьмеркавалі па едакох

У калгасе «Бязбожнік», (Пухавіцкі раён),—84 кілё мяса разьмеркавалі не па працаднёх, а па едакох. На кожнага члена калгасу прыпалося па 2 кілё мяса, якое было выначана нават і тым, хто ў калгасе зусім не працуе.

Праўленьне калгасу за такі кулацкі падыход да разьмеркаваньня прыбытку павінна быць прыцягнута да адказнасьці.

Н.

Шклозавод павінен быць закончан у тэрмін

Гомельскі шклозавод павінен закончыць будаўніцтва да 1-га красавіка 1932 г. На будаўніцтве працуюць 1060 чалавек. Рабочай сілы для будаўніцтва дастаткова. Паасобныя цэхі ўжо закончаны. На завод прыбываюць машыны Фурко. Прыбыло дзьве плятформы для газагенэратараў.

Заводам праводзіцца загатоўка апалу. Будуецца вузкакалейка для прывозкі торфу. Ужо ёсьць 120 тысяч пудоў піску першага гатунку. Зараз разгарнулася падрыхтоўка кадраў. 320 чалавек будуць у хуткім часе накіраваны ў існуючыя заводы Данбасу і Канстанцінаўкі для падрыхтоўкі.

Для рабочых будуецца 5 чатырохпавярховых дамоў на 25 кватэр. Два дамы ўжо закончаны, а ў трох заканчваюць унутраное абсталяваньне. Асабліва цяжкае становішча з будаўнічым матар'ялам. Не хапае агнятрывалай цэглы для будаўніцтва ванных пячэй, а таксама рэек для пабудовы вузкакалейкі.

Кіраўніцтва заводу ставіла пытаньне перад Шклоаб'яднаньнем і Саюзшкло фарфарам, але выніКаў да гэтага часу няма. Заводакіраўніцтва заяўляе, што завод будзе скончаны ў тэрмін, калі адпаведныя арганізацыі дапамогуць забесьпечыць завод патрэбным будаўнічым матар'ялам. (Белта).

Сёньня вучэньне па сьветамаскіроўцы

22-га кастрычніка а 23 гадзіне будзе праводзіцца вучэньне па сьветамаскіроўцы.

Спачатку вучэньня будзе дан сігнал «Паветранай трывогі», які будзе зьлучыцца пачаткам вучэньня.

Вучэньне па сьветамаскіроўцы будзе працягвацца да сыгналу адбой. Па сыгналу «Паветранай трывогі» трэба ўжыць усе меры, якія забясьпечваюць зацямненьне гораду.

1. Вулічныя ліхтары выключаюцца Эльводам.

2. Надворныя лямпачкі ля дамоў выключаюцца па распараджэньні старшынь жаКтаў.

3. На прадпрыемствах і ва ўстановах, выключэньне сьвету праводзіцца распараджэньнем дырэктараў прадпрыемстваў (бяз шкоды вытворчасьці).

Усяму насельніцтву забараняецца запальваць сьвятло, калі вокны ня будуць занавешаны сьвета-непранікаючымі шторамі.

За невыкананьне даных указаньняў, асобы будуць прыцягвацца да адказнасьці згодна абавязковай пастановы Менгарсавету ад 12 верасьня, абвешчанай у друку ад 14 верасня.

Збор рабочых па сыгналу 22-га кастрычніка не праводзіць.

Час. начальнік штабу СПА г. Менску Капіцын.

Ніводнага цэнтнэра збожжа прыватніку
(З пастановы ЦК УсеКП(б)

ЛІКВІДАВАЦЬ ГАНЕБНАЕ АДСТАВАНЬНЕ

У БОЙ ЗА НАРАСТАНЬНЕ ТЭМПАЎ ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК. КЛІЧАЎСКІ РАЁН ГАНЕБНА ЦЯГНЕЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ

Ліквідаваць прарыў у кантрактацыі азімых

Ня гледзячы на цэлы рад дырэктыў партыйных і савецкіх органаў аб правядзеньні кантрактацыі азімых пасеваў і на тое, што гэта работа мае выключнае гаспадарча-палітычнае значэньне, большасьць раёнаў БССР на гэта не зьвярнулі належнай увагі. У выніку мы маем ганебнае невыкананьне пляну кантрактацыі, тэрмін якога скончыўся яшчэ 15 кастрычніка. Плян кантрактацыі выкананы ўсяго на 29,8 проц.

Некаторыя раёны як: **Асіпавіцкі, Бялыніцкі, Жыткавіцкі, Клічаўскі, Плешчаніцкі, Магілеўскі, Бабруйскі, Віцебскі** кантрактацыю нават зусім не пачналі, у той час, калі рад раёнаў пляны кантрактацыі выканалі і перавыканалі. Так **Лоеўскі раён плян кантрактацыі азімых выканаў на 127 проц., Чырвонаслабодзкі—на 107 проц.**

Затое Пухавіцкі, Рагачэўскі, Петрыкаўскі, Чачэрскі, Лельчыцкі, Жлобінскі, Быхаўскі, Мазырскі, Камарынскі і Касьцюковіцкі раёны ня выканалі нават і 15 проц. пляну кантрактацыі.

Навакол кантрактацыі ў гэтых раёнах ня было разгорнута растлумачальнай работы сярод калгаснікаў і бяднацка-серадняцкай часткі аднаасобнікаў. Сельскія саветы і партыйныя ячэйкі зусім ня цікавіліся гэтай справай. У Пухавіцкім раёне шмат сельскіх саветаў (Сінчанокі, Пярэжырскі, Сущінскі, Рудзенскі і інш.) амаль зусім яшчэ не пачалі кантрактацыі азімых.

Да канкрэтных зрывішчыкаў кантрактацыі ня ўжываецца ніякіх захадаў. У правядзеньні кантрактацыі па гэтых раёнах панае паўнейшы самацёк.

Трэба адстаўшым раёнам зьвярнуць асаблівую ўвагу на кантрактацыю. Хаця і з некаторым спазьненьнем, плян кантрактацыі павінен быць поўнасьцю выкананы.

Юры Касьцяневіч.

Загатоўкі па Чэрвеньскім раёне праходзяць самацёкам

Чэрвеньскі раён у правядзеньні збожжазагатовак ганебна адстае. На 15-X—плян збожжазагатовак па раёне выкананы толькі на 14 проц.

Ёсьць сельсаветы, якія амаль-што не пачалі збожжазагатоўчай кампаніі. На прыклад, **Ляднянскі дедзь выканаў толькі 04 проц. гадавога пляну, Грабянецкі—4,5 проц., Хутарскі—4,5 проц., Руднянскі — 6 проц., Калодзецкі — 6,1 проц. і Рэвяненцкі — 6,4 проц.**

У Хутарскім сельсавеце толькі 7-X— г. г. былі праведзены па вёсках агульныя сходы аб самаабязацельствах па загатоўках і скончана дзвядзеньне цьвёрдых заданьняў да кулацкі-заможных гаспадарак.

Асабліва дрэнна абстаіць справа па раёне са спагнаньнем цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак, з якіх на 15-X—г. г. было спагнана па збожжы толькі 13 проц. заданьня). На спагнаньне цьвёрдых заданьняў да гэтага часу ні сельсавет, ні раённыя арганізацыі не зьвярталі ўвагі і ніхто гэтай справай фактычна не займаўся.

Паміж загатоўчымі арганізацыямі — райкаапсаюзам і райсаюзам не разьмеркавана работа па правядзеньні збожжазагатоўчай кампаніі, ня вызначаны сельсаветы, у якіх яны павінны праводзіць загатоўкі.

Районаб зусім ня кіруе работай загатоўчых арганізацый. Мер узьдзейнічаньня супроць канкрэтных зрыўшчыкаў загатовак і кулакоў, якія злосна ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, ня прымаецца і ў гэтым значна вінавата райпракуратура і судовыя органы раёну.

Вельмі дрэнна праходзяць збожжазагатоўкі і па калгасах. На працягу мінулай пяцідзёнкі, з 10-га па 15-га кастрычніка, ніводзін калгас ня здаў ні аднаго кілё збожжа.

Да гэтага часу ніякай растлумачальнай масавай работы аб палітычна-гаспадарчым значэньні збожжазагатовак сярод калгаснікаў не праводзіла ся, і не праводзіцца зараз. Райкалгассаюз зусім нічога не зрабіў, каб узмацніць ход збожжазагатовак па калгасах.

Адсутнасьць апэрацыйнага кіраўніцтва, спадзяваньне на самацёк і патураньне кулаку — ўсё гэта вельмі дрэнна адбіваецца на выкананьні пляну загатовак.

Зараз раён павінен ўжыць усе меры да ліквідацыі ганебнага прарыву ў збожжазагатоўках. Трэба мабілізаваць усе сілы на сваячасовае выкананьне пляну па збожжазагатоўках, рашуча ўдарыць па апартуністычнай бяздзейнасьці загатоўчых арганізацый, сельсветаў і праўленьняў калгасаў, якія гэтым толькі зрываюць пасьпяховае выкананьне пляну збожжазагатовак.

Сайкоў.

Вушаччына павінна рашуча ўзмацніць тэмпы збожжазагатовак

Збожжазагатоўкі па Вушацкім раёне праходзяць марудным тэмпам. Раённыя загатоўчыя арганізацыі гэту кампанію сустрэлі непадрыхтаванай і аб палітычна - гаспадарчай важнасьці збожжазагатовак не правялі масавага растлумачальнай работы сярод адатчыкаў. Райарганізацыі ня здолелі арганізаваць здачу лішкаў збожжа адразу пасьля абмалоту.

Паасобныя сельсаветы (Пліскі, Весьніцкі і іншыя) зрабілі шмат перагібаў у давядзеньні цьвёрдых заданьняў, якія часта даводзілася да серадняцкіх гаспадарак у той час, калі сапраўдныя кулакі засталіся незарэгістраванымі. Выпрабаваньне дапушчаных памылак значна затарміза́ла ход збожжазагатовак.

Гадавы плян збожжазагатовак на 15 кастрычніка па раёне выкананы на 37,5 проц., але гэтая лічба ідзе за кошт некаторых перадавых сельсаветаў—**Мазырскага і М.-Далецкага**, якія заканчваюць збожжазагатоўкі.

Асабліва ганебна праходзіць збожжазагатоўчая кампанія ў **Жарскім, Гарадзецкім і Кубліцкім сельсаветах.**

Раённыя, якія ня лепшых, Вушаччына рашуча павінна ўзмацніць тэмпы збожжазагатовак.

Юрка Росны.

Клічаўскі раён ганебна адстаўвае збожжазагатоўкі

Збожжазагатоўкі ў Клічаўскім р. разгорнуты вельмі слаба. Раённы гадавы плян выкананы ўсяго на 9,2 проц. на 15—X—гг. Райкалгассаюз ня кіруе правядзеньнем збожжазагатоўчай кампаніі у калгасах і ня прымае ніякіх захадаў да тых праўленьняў калгасаў, якія бяздзейнічаюць у гэтым напрамку...

Вельмі дрэнна ідзе спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможнай часткі. Па сельсавеце спагнана толькі 10 проц. цьвёрдых заданьняў. Карыстаючыся бяздзейнасьцю сельсавету, кулакі вывозяць збожжа на прыватны рынак.

РУБАШНЫ Яўген.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

ЦК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што ў м. Крупкі — 27-X, г. Барысаве 28 і 29—X, а 10-й гадзіне раніцы будзе працаваць Выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынствам т. Аверына.

На ПТ выклікаюцца наступныя т. т.

На 27-X — м. Крупкі:

Драніца А. А., Шостак П. І., Шкробат М. Д.; Дзямчук А. А., Маляраўіч С. Т., Маласай П: М., Сакавец В. П:, Камель Х: Н:, Аляксейнка А. А., Кісьлякоў М. К., Падкапаеў С. М., Кулікаў А: Х, Бачыціна М. Х.

На 28-X — г. Барысаў:

Ліхтарман А. Я., Якімовіч А. Г., Маскоўчыў М. Я., Уланава Х. Я., Жуковіч М. Д., Сьвіткоўскі Р. А.

На 29-X — г. Барысаў:

Ліц А. М., Літвіна З. А., Герман Ахрэм, Пучкоў А: Л:, Жыцін М. Е:, Масарноўскі С. Т., Страпкоў В. Р.

ПК ЦКК КП(б)Б просіць зьявіцца ў ПК т.т. Паўлава Рыгора Гаўрылавіча і Гедра Балеслава Людвігавіча (Гомельшчына), Хамецкага Рамана Міхасёва (з Альшанску УССР), або паведаміць свой адрас (ці месца працы).

Просьба да ўсіх арганізацый ведаючых месца знаходжаньня памянёных т.т. паведаміць у П. К.

З 20 кастрычніка па 5 лістапада 1931 г. праводзіцца перарэгістрацыя ўсіх членаў Менскай Асацыяцыі Пралетарскіх Пісьменьнікаў (усіх секцый).

Таварышы, якія ня пройдуць у гэты тэрмін перарэгістрацыі,—механічна выбываюць з арганізацыі. Перарэгістрацыя праводзіцца ў Д. Пісьменьніка штодзённа ад 12 да 16 гадзін дня.

Сакратарыят МЕНАПП.

Быхаўскі раён!

Поймай выклік Крупскага раёну

Улічваючы выключна важнае гаспадарча-эканамічнае і палітычнае значэньне выкананьня пляну адгрузкі 10.800 тон бульбы Ленінграду да наступленьня марозаў, і ў мэтах зьнішчэньня пагрозы зрыву гэтага пляну, увесь склад пленуму Крупскага райвыканкому на паседжаньні ад 8 кастрычніка абвясьціў сябе мабілізаваным на датэрміновае выкананьне пляну бульбазагатовак.

Пленум выклікае партыйна-савецкія і прафэсіянальныя арганізацыі Быхаўскага раёну на сацспаборніцтва і прымае на сябе наступныя абавязацельствы:

1. Скончыць адгрузку 10.800 тон бульбы на Крупскім раёне да 25 кастрычніка г. г.

2. Арганізаваць ня менш 5 чырвоных эшалёнаў у гор. Ленінград.

3. Са здавальненьнем адзначаючы ініцыятыву калгасаў «Новы Лад», «Прэч Саха» і «Чырвоная Зьмена», якія высунулі сустрэчныя пляны адгрузкі бульбы Ленінграду, пленум прымае абавязацельства перавесьці гэты вопыт у другія калгасы і дамагчыся сустрэчнага пляну па калгасах у бок павялічэньня да 75 проц. заданьня.

4. Разам з гэтым аказаць максымальнае садзейнічаньне выкананьню іншых відаў загатовак і мабілізацыі сродкаў.

5. Правядзімая з 20 кастрычніка па 10 лістапада справаздачная кампанія аб рабоце саветаў павінна быць падана радкавана ўказаным вышэй задачам, сваячасоваму выкананьню пляну бульбазагатовак і іншых відаў загатовак, а таксама мабілізацыі сродкаў.

Усю гэту работу пленум абяцае пра весьці пры шырокім разгартваньні масавай растлумачальнай работы, максымальным разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сельсаветамі, вёскамі і калгасамі, арганізацыі чырвоных абозаў, выдачы рашучую барацьбу са спробамі «лявацкіх» перагібаў і апартуністычным ныцьцём аб «невыкананьні» пляну, рашуча змагацца з кулацкімі элемэнтамі згуртоўваючы бяднацка-серадняцкія масы і калгаснікаў на падвышэньне тэмпаў калектывізацыі і далейшае замацаваньне калгасаў, выдачы барацьбу за правядзеньне генэральнай лініі камуністычнай партыі.

Пленум Крупскага райвыканкому.

Прарывы за прарывамі!

Шклоў. (Наш кар.). Выкананьне прамфінпляну на папяровай фабрыцы «Спартак» за апошнія 6 дзён не пасунулася наперад. За шэсьць дзён з 5-га па 10 кастрычніка ўключна па трох машынах выкананьне прамфінпляну складае 77,7 проц., што зусім недапусьціма. Асабліва адстае ў выкананьні першая папер-машына, якая за 9-е кастрычніка выканала свой прамфінплян на 57,5 проц., за 7-е на 71,3 проц.

П. Шклоўскі.

Адказны рэдактар
П. ШАСТАКОЎ.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА	Замежны фільм Сапраўдныя паны у 8 част. Звыш праграмы: Ударная будоўля Пач. а 7 г.
КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ	Мастацкі фільм ЗЕЛІМХАН Звыш праграмы хроніка
КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"	Монцы Бэнкс у замежн. фільме ГОНШЧЫК СУПРОЦЬ ВОЛІ П чат. 1 сэансу а 2 г.
„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"	Новы амэрык. фільм Даліна палымеючых скал Дз. ў 7 част Пач а 7. 8-45; 10 30 каса 5 г.

НОРМА ПАЛЯРОС АДПУСКАЕЦЦА
ва ўсіх магазынах Белгандлю
па наборных кніжках членам каапэрацыі,
для рабочых і служачых
за кастрычнік, лістапад, і сьнежань месяцы г. г.
ПА ЦЬВЁРДЫХ ЦЭНАХ
Белгандль

Выдавецтва „Савецкая Беларусь"

УСІМ!!!

Наркамтам і ведамствам, партыйным, прафсыяпальным і каапэрацыйным арганізацыям, навукова-дасьледчым і навучальным установам, пляновым часткам ведамстваў і райплянкамісіям ды інш.

На днях выходзіць з друку палітыка-эканамічны часопіс
ОРГАН ДЗЯРЖПЛЯНУ
„САЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ БУДАЎНІЦТВА"
№ 7 прысьвечаны вынікам чысткі і перабудове работы апарату Дзяржпляну БССР. **№ 7**

ЗЬМЕСТ НУМАРУ: Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б ад 21 мая 1931 г. Артыкулы: І. ВЕРБА—„Вынікі чысткі апарату Дзяржпляну і задачы плянавага апарату"; І. ВЕРБА і А. НОТКІН—„Шляхі эканамічнага разьвіцьця Савецкай Беларусі ў працэсе шкодніцтва"; Д. ЧУДНОЎСКІ—„Як плянавалася прамысловасьць БССР"; В. С. АКСЕЛЬРОД—„Супроць громанашчыны, за марксысцка-ленінскую мэтадалегію, за выкананьне пляну"; Г. БОНДАР—„Іх пляны, установка і практыка".

З прычыны абмяжаванага ліку экзэмпляраў нумар у розьнічны продаж паступіць у вельмі незначнай колькасьці.

Папярэднія заяўкі на набыцьцё нумару 7 і падпіска наогул на часопіс „СБ" прымаецца выключна праз пошту і лістаносцаў.

Умовы падпіскі: НА год 7 р. 50 к., на 6 м.—4 р. кошт асобнага нумару 1 р.

Падрыхтаваны і здаецца ў друк № 8-9, прысьвечаны пляну электрыфікацыі народнай гаспадаркі БССР.

Згодна загаду Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфаў ад 22-га верасьня 1931 году,
АДДЗЕЛ РАСПАЎСЮДЖВАНЬНЯ ДРУКУ БЕЛАРУСКАГА КІРАЎНІЦТВА СУВЯЗІ
ПЕРАІМЕНАВАНЫ
Ў „БЕЛАРУСКУЮ КАНТОРУ САЮЗДРУК"
з пераходам на гаспадарчы разрахунак **з 1 кастрычніка 1931 г.**
№ кант. рахунку пры Бел. канторы Дзяржбанку Менск 452-1422
Адрас канторы Саюздруку: Карла Маркса № 10, 1-шы паверх (АТС), № тэлефона 14-86
БЕЛКАНТОРА САЮЗДРУКУ

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ
на штодзенную газэту
„САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"
ОРГАН ЦВК І СНК БССР

Умовы падпіскі:	1 мес.	3 мес.	6 мес.	12 мес.
	1 руб.	3 руб.	6 руб.	12 руб.

Падпіска прымаецца выключна на пошце.
Адрас рэдакцыі і выд-ва Менск Пляц Волі, 17.

Стара Барысаўскі сьвінагадоўчы тэхнікум
АБВЯШЧАЕ ПРЫЕМ НА 9-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ ТЭХНІКАЎ СЬВІНАВОДАЎ
Пачатак запяткаў 25 кастрычніка. Пажаданы рэкамэндацыі і камандыроўкі.
Бяз іспытаў прымаюцца маючыя адукацыю ня ніжэй 6 клясаў сямігодкі. Патрэбны дакумэнты: 1) аб саціяновішчы, 2) аб праве голасу, 3) аб узросьце, 4) аб адукацыі, 5) аб здароўі
Умовы вучобы: усім стыпэндыя 85 р. і інтэрнат.
Заявы падаваць: гор. Барысаў, Стара-Барысаўскі сьвін-тэхнікум.
Дырэктар А. ЛЕНКОЎ.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Сямёнаву Я. М. за хуліганства.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Гамшэю У. З. за парушэньне дырэктыў ураду ў галіне крэдытнай рэформы.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Лушыцу А. А. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Грабскаму В. М. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Сядзеку К. за самаўласнае ўсяленьне ў радзільны дом і за дэбош.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Бэйні за парушэньне пастановы СНК б крэдытнай рэформе.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Рудкоўскаму Я. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне інвалідзкай арцелі «Зорка» № 7 Малевічу М. М., за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд 1 вуч. г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Валасэвічу М. М. за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Гр-ка Казёл Яўгенія Марцінава, нарадж. 1900 г., жыхарка гор. Рэчыцы, зьмяняе сваё прозьвішча на прозьвішча Лонская.

Асобы, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць Рэчыцкі гар. ЗАГС з паказаньнем свайго прозьвішча, імя і імя па бацьку і месца жыхарства.

Згодна прыгавору нарсуду Брагінскага раёну абвяшчаецца грамадзкае ганьбаваньне калгасьніку калгасу «Чырвоны Арэты» Сацуры З. П. за зьнявагу.

Жылкамера г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне рабочаму заг. імя Варашылава Макоўскаму К. за самаўпраўства.

Жылкамера г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне міліцыянеру рэзерву міліцыі Даніленко Міхасю П. за самаўпраўства.

Жылкамера г. Менску абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне заг. гаспадаркі НКЗ Круковічу за самаўпраўства.

Гр-ка Казёл Ніна Марцінава, нарадж. 1913 г., жыхарка гор. Рэчыцы, зьмяняе сваё прозьвішча на прозьвішча Лонская;

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сэктараў —6-15. Выдавецтва—2-44. Выпускаючага 12-65 (два званкі)
Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб.
паўнаваж. Галоўлітбела № А—2521.
Друкарня імя тав. СТАЛІНА.

ПРЭЗІДЭНТСКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ЭПАР ПланСкан А2В
Лінейная калібровочная мішень LRT-BE4-V2